

ДОМ ЗА БАЗАВУЮ

3

ГОГАЛЬ МОЦНА Б ЗДЗІВІЎСЯ...



16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ліпеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 142 (30276)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ЛЮБЕЦКАЯ, суддзя Канстытуцыйнага Суда:**

*«Што датычыцца далейшага развіцця інстытута Прэзідэнта, вельмі цікавы этап мы перажываем. Тыя палажэнні, якія былі замацаваны, і бачанне Прэзідэнтам далейшага развіцця іншых галін улады — усё гэта звязана з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў. Гэта новы этап развіцця як для самога інстытута прэзідэнцтва, так і для іншых галін улады, на якія ўскладаецца частка паўнамоцтваў і частка адказнасці».*

# На траіх адно неба



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Аляксандр і Ганна ЛІПАЎСКІЯ даўно звязалі свой лёс з авіяцыяй. Муж працуе намеснікам камандзіра лётнага атрада авіякампаніі «Белавія», жонка ў гэтай жа кампаніі адказвае за работу з моладдзю. Хутчэй лагічна, чым дзіўна, што і сын Максім вырашыў працягнуць палётную дынастыю: ён скончыў першы курс Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, дзе вучыцца на лётчыка.**

## КОРАТКА

- **Беларуская дэлегацыя на чале з першым намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандрам Корбутам прымае ўдзел у 46-й сесіі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якая праходзіць гэтымі днямі ў Дэлі.**
- У Беларусі намалочана збожжа з улікам рапсу 3,492 млн тон, з іх — 2,563 млн тон збожжавых і зернебабовых культур, 929 тыс. тон азімага рапсу.
- **БелАЗ падпісаў з расійскімі партнёрамі пагадненне, якое прадугледжвае пастаўку трох 130-тонных самазвалаў-гібрыдаў, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва вадарод, для пачатку іх доследнай эксплуатацыі на Сахаліне.**
- Акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага ўпершыню адправіцца на гастролі ў Сочы.

ISSN 1990 — 763X

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## І Ў АГОНЬ, І Ў ВАДУ, І НА ЛЮБЫЯ ВЫШЫНІ

### Як гэта — быць сучасным ратавальнікам?



**Журналістам нярэдка даводзіцца пісаць пра надзвычайныя сітуацыі. Але прадстаўнікі СМІ не заўсёды ўяўляюць спецыфіку работы супрацоўнікаў МНС у поўным аб'ёме. Таму выратавальнае ведамства арганізавала для журналістаў спецыяльнае навучальнае мерапрыемства. Так, днямі ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС адбыўся семінар «Адзін дзень з МНС». Карэспандэнт «Звязды» паглыбіўся ў прафесію ратавальніка, прымерыў ахоўнае адзенне і паспрабаваў сябе ў барацьбе са стыхіяй.**

СТАР. 4

Соцыум

## Першае месца

### Як зрабіць так, каб адаптацыя маладога спецыяліста была ўдалай



**Паспяховая адаптацыя маладога спецыяліста на першым працоўным месцы — пытанне дзяржаўнай важнасці. Работнік яшчэ не пачаў выконваць свае абавязкі, а ў яго ўжо ўкладзены час і фінансавыя сродкі. У тым, каб гэтая адаптацыя адбывалася як мага хутчэй і «без болю», зацікаўленыя і работадавец, і сам малады спецыяліст, для якога гэта сур'ёзны жыццёвы этап. Бо першае працоўнае месца, як і ўсё першае (ад першага кахання да першай сесіі) ніколі не забудзецца. І ад таго, якія пачуцці будзе выклікаць гэты ўспамін, шмат у чым залежыць шлях чалавека ў прафесіі.**

СТАР. 5

З першых вуснаў

Амурская вобласць — далёкая толькі геаграфічна

# Мы адкрыты да супрацоўніцтва па самым шырокім спектры тавараў і паслуг

**У гэтыя дні ў Беларусі з візітам знаходзіцца дэлегацыя Амурскай вобласці на чале з губернатарам Васіліем Арловым. Раней дэлегацыі гэтага рэгіёна на ўзроўні губернатара нашу краіну не наведвалі. Гістарычнасць моманту замацавала і сустрэча Васілія Арлова, які ў статусе губернатара наведвае нашу краіну ўпершыню, з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Падчас гэтай сустрэчы былі акрэслены найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва.**

Вітаючы гасцей, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Амурскую вобласць раздзяляюць тысячы кіламетраў, але нашы лёсы цесна звязаны сумеснай гісторыяй, самааддданай працай па аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі, рэалізацыяй грандыёзных прамысловых, транспартных і энергетычных праектаў. «У прыватнасці, у вашай вобласці знаходзіцца «сталіца» Байкала-Амурскай магістралі, паўвекавы юбілей якой мы адзначылі 8 ліпеня. Гэта адзін з самых маштабных праектаў у гісторыі чалавецтва. 60 тысяч беларусаў удзельнічала ў будаўніцтве БАМа», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і сёння ў Амурскай вобласці рэалізуюцца маштабныя інфраструктурныя праекты: касмадром «Усходні», узводзяцца газахімічныя гіганты, сярод якіх Амурскі газахімічны комплекс і Амурскі газаперапрацоўчы завод, комплекс звадкавання прыроднага газу і іншыя. «Магчыма, праца і беларускіх будаўнікоў недзе будзе запатрабавана», — заўважыў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што актыўна развіваецца і Благавешчанск: «Як мне дакладваюць, толькі будпляцоўка Далёкаўсходняга квартала прадугледжвае ўзвядзенне ў горадзе каля 334 тысяч квадратных метраў жылля. Планы рэгіёна па павелічэнні здабычы карысных выкапняў дазваляюць разлічваць на прадаж пастаўкі кар'ерных самазвалаў БелАЗ».

Амурская вобласць — экспарцёр электраэнергіі. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, інтэнсіўнае развіццё электратранспарту ў суседнім Кітаі неўзабаве перакінецца праз Амур і запатрабуе больш дынамічнага развіцця спецыяльнай — электразараднай інфраструктуры. Ён падкрэсліў, што складнікі і элементы гэтай інфраструктуры вырабляюцца ў Беларусі больш чым пяць гадоў і паспяхова эксплуатуюцца. «Калі ў вас будзе да гэтага інтарэс, мы з задавальненнем вам усё гэта пакажам», — паабяцаў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца аграпрамысловага комплексу, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія вучоныя-аграрыі зацікаўлены ўдзельнічаць у праектах па мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай і тэхналагічнай базы раслінаводства, жывёлагадоўлі, селекцыі сельскагаспадарчых культур, перапрацоўчай прамысловасці. «Кампетэнцыі ў Беларусі сур'ёзныя ў гэтым плане. Прыродны патэнцыял вобласці дазваляе значна дыверсіфікаваць наменклатуру сельгаспрадукцыі, якая вырошчваецца. І ў гэтым мы гатовы вас падтрымаць. Акрамя таго, у дапамогу будуць і машыны сельскагаспадарчага прызначэння, уключаючы трактарную тэхніку, збожжаўборачныя і кормаўборачныя камбайны, навяснае абсталяванне да іх, абсталяванне для жывёлагадоўчых і малочнатаварных ферм. Мы здольныя таксама павялічыць экспарт у Амурскую вобласць усёй запатрабаванай харчовай прадукцыі, у тым ліку сокаў і дзіцячага харчавання, а таксама іншых неабходных тавараў», — прапанаваў беларускі лідар. Пры гэтым, па яго словах, магчыма стварэнне ў вобласці беларускага гандлёвага дома для наладжвання і арганізацыі прамых паставак беларускіх прадуктаў харчавання.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта далёка не поўны пералік кірункаў, па якіх у Беларусі і Амурскай вобласці ўжо створаны пэўны зачын. «Але мы адкрыты да супрацоўніцтва па самым шырокім спектры тавараў і паслуг. Я думаю, сустрэча на беларускай зямлі з адказнымі асобамі, членамі ўрада, вашы пажаданні будуць абавязкова ўспрыняты як сігнал да дзеяння. Мы гатовы гэтаму, толькі геаграфічна далёкаму, краю аказаць усялякую дапамогу і падтрымку, на якую мы толькі здольныя. Толькі геаграфічна далёкім, але зусім не чужому і вельмі прыгожаму краю», — сказаў ён.

## «Мы прыехалі сюды, каб максімальна эфектыўна папрацаваць»

У сваю чаргу, Васілій Арлоў адзначыў, што разам з ім прыехала вялікая дэлегацыя — некалькі намеснікаў старшыні ўрада рэгіёна, рэгіянальныя міністры, прадстаўнікі бізнесу, ВНУ. «Мы прыехалі сюды, каб максімальна эфектыўна папрацаваць», — сказаў ён. Васілій Арлоў падкрэсліў, што з пачатку 2000-х гадоў дзейнічае пагадненне аб узаемадзеянні Беларусі і Амурскай вобласці. Павялічваецца гандлёвы абарот, але, па словах губернатара Амурскай вобласці, ёсць куды расці.

Васілій Арлоў вылучыў тэмы, у якіх супрацоўніцтва Беларусі і Амурскай вобласці бачыцца перспектыўным. «У нас вельмі запатрабаваная ў рэгіёне тэхніка беларускай вытворчасці, не толькі сельскагаспадарчая, але і прамысловая. Напрыклад, у сельскай гаспадарцы 40 працэнтаў трактароў — трактары беларускай вытворчасці — і 25 працэнтаў камбайнаў — беларускай вытворчасці. Мы лічым мэтазгодным прапанаваць нашым беларускім сябрам стварыць мультыбрэндавы цэнтр тэхнікі на тэрыторыі Амурскай вобласці. Ён мог бы ахапіць і суседнія рэгіёны», — сказаў ён. Губернатар расказаў, што ў яго рэгіёне 1 млн 200 тысяч пасяўных плошчаў, стаяць сур'ёзныя задачы па павелічэнні вытворчасці. І тут, па яго словах, будзе карысны досвед беларускіх калег у плане глыбокай перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Васілій Арлоў падкрэсліў, што спецыялісты Амурскай вобласці гатовы да супрацоўніцтва ў сферы дрэваапрацоўкі. «У нас у рамках расійскага заканадаўства дзейнічае тэрыторыя апераджальнага развіцця, дзе сабраны льготы для інвестараў. І на фінальнай стадыі ва ўрадзе Расіі знаходзіцца дакумент аб стварэнні міжнародных тэрыторый апераджальнага развіцця. І тут я хацеў бы перайсці да яшчэ адной найважнейшай тэмы — нашага ўзаемадзеяння з Кітайскай Народнай Рэспублікай, з якой у нас 1200 кіламетраў дзяржаўнай граніцы. І ў нас назапашаны каласальны досвед працы з Кітаем — некалькі соцень мерапрыемстваў у сацыяльна-культурнай сферы штогод праводзіцца сумесна з КНР, некалькі транспартна-лагістычных маршрутаў пракладзена. У прыватнасці, мы развіваем праект «Амурскі калідор», які складаецца з ужо пабудаванага аўтамабільнага моста праз раку Амур, што злучае Благавешчанск і Хэйхэ, з развіццём перадмастовай зоны, яна таксама мае статус тэрыторыі апераджальнага развіцця. Таму запрашаем беларускіх партнёраў і інвестараў прысутнічаць у гэтым «Амурскім калідоры», — сказаў ён.

### У тэму

**«Запрашаем беларускіх інвестараў»**

Журналістам па выніках сустрэчы Васілій Арлоў расказаў, што асноўнай тэмай яго перагавораў з беларускім лідарам стала павелічэнне тавараабароту паміж Беларуссю і Амурскай вобласцю, які ў 2023 годзе склаўся ў аб'ёме 36,6 мільёна долараў. Па словах губернатара, у рэгіёне вельмі запатрабаваная тэхніка беларускай вытворчасці. Абмеркавалі і пытанні перапрацоўкі. «У Амурскай вобласці інтэнсіўна развіваецца газавы кластар, які складаецца з двух буйных праектаў — газаперапрацоўчы завод «Газпрама» і газахімічны комплекс, які рэалізуе кампанія «Сібур». На базе гэтых двух прадпрыемстваў плануецца будаўніцтва індустрыяльнага парка. І мы таксама запрашаем беларускіх інвестараў», — прапанаваў Васілій Арлоў. Яшчэ адным перспектыўным кірункам супрацоўніцтва ён назваў лагістыку.

«Вельмі важнае пытанне — гэта пытанне культурных абменаў. Трэба зрабіць акцэнт на абмен дзіцячымі дэлегацыямі для таго, каб захаваць нашу агульную гістарычную памяць і ўбачыць шмат цікавых месцаў. Акрамя таго, наша геаграфічнае становішча дазваляе за адну паездку наведаць адразу дзве дзяржавы — Расію і Кітай. Аляксандр Рыгоравіч гэта падтрымаў», — адзначыў губернатар Амурскай вобласці.

Васілій Арлоў нагадаў, што на будаўніцтве касмадрома «Усходні» працавалі і беларусы. Сёння скончана другая чарга будаўніцтва. Па яго словах, праект разлічаны на доўгія гады і там заўсёды будуць рады і беларускім спецыялістам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Кампетэнтна

# КРАІНА ЧАКАЕ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

У шэрагі студэнтаў беларускіх ВНУ ўліліся будучыя педагогі, медыкі, інжынеры, спецыялісты іншых галін, запатрабаваных у эканоміцы

**Уступная кампанія ва ўстановы вышэйшай адукацыі Беларусі завяршаецца. Па асобных спецыяльнасцях унутраныя экзамены працягнуцца па 25 ліпеня — абітурыенты здаюць творчыя іспыты, выконваюць заданні па малюнку, нарматывы фізпадрыхтоўкі і г. д. 22 ліпеня, па трох сертыфікатах ЦЭ/ЦТ, шчаслівчыкі ўжо ўбачылі свае прозвішчы ў спісе залічаных, 26-га такі ж спіс з'явіцца і для тых, хто здаваў унутраныя іспыты. ВНУ тым часам пачалі падводзіць вынікі прыёмнай кампаніі. Канчатковая статыстыка вымалюецца пазней. Але ўжо сёння можна зрабіць папярэдні агульны каментарый і ацаніць ход уступнай кампаніі 2024 года, аб чым мы і папрасілі намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы, доктара гістарычных навук, дацэнта Вячаслава ДАНІЛОВІЧА.**

— Усе этапы ўступнай кампаніі, якія ўжо прайшлі — цэнтралізаваныя іспыт і тэсціраванне, уступныя экзамены — сведчаць аб яе якаснай падрыхтоўцы і правядзенні як з боку адпаведных органаў, так і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Адметная рыса цяперашняй уступнай — яна праходзіць ва ўмовах кропкавых карэкціровак, якія былі прыўнесены яшчэ ў снежні 2023 года Указам Прэзідэнта Беларусі і накіраваны на забеспячэнне роўных, празрыстых магчымасцяў для абітурыентаў і забеспячэнне ўпарадкавання мэтавага набору. Карэкціроўкі далі дадатковыя магчымасці паступлення ў нашы ВНУ адоранай таленавітай моладзі. Калі казаць у цэлым, гэта зрабіла аб'ектыўнасць ацэнкі ведаў яшчэ больш высокай і дакладнай.

***— Першымі студэнтамі ВНУ сталі абітурыенты, якія паступалі па мэтавым прызначэнні. Каго найбольш за ўсіх там чакалі?***

— Будучых медыкаў, педагогаў, інжынераў. І чаканні апраўдаліся — толькі ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт прынята 673 чалавекі, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка прыняў 289 чалавек, значнай колькасцю будучых інжынераў (266 чалавек) папоўніўся Беларускі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт. І гэта толькі ў вядучых сталічных ВНУ.

Гэта значыць — усё ў свой час было зроблена правільна і прадумана. Сёлета абітурыенты з мэтавымі дагаворамі атрымалі дадатковыя магчымасці і опцыі пры паступленні ў выбраныя імі ВНУ. Упарадкавана практыка мэтавага набору. Міністэрствам адукацыі створаны і зарэгістраваны рэестр заявак на мэтавую падрыхтоўку ад органаў і арганізацый, якія дзейнічаюць на тэрыторыі нашай краіны. Прыёмная кампанія на гэтую траекторыю праходзіла асобна ад агульнай. А этапы ўступнай кампаніі былі сплапаваны так, каб маладыя людзі, якія не пройдуць на мэтавыя месцы, змаглі б удзельнічаць у агульным конкурсе, атрымаўшы магчымасць паступіць на бюджэтнае ці платнае навучанне. Пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх і абласных алімпіяд, медалісты і ўладальнікі чырвоных дыпломаў каледжаў, выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарку і ліцэяў ВНУ таксама атрымалі важкія дадатковыя опцыі пры паступленні.

***— Дзесяцікласнікі — гэта ўжо не дзеці, але яшчэ і дарослыя людзі. Як вы лічыце, іх выбар арганізацыі, спецыяльнасці, па якой яны збіраюцца навучацца па мэтавай траекторыі, дастаткова сталы, ці, будзем шчырымі, яны выкарыстоўваюць такую магчымасць, каб гарантавана паступіць у ВНУ?***

— Адна з мэт дадзенай траекторыі навучання якраз і заключаецца ў тым, каб моладзь мела магчымасць вызначыцца са сваёй будучыняй як мага раней. Такую магчымасць, дарэчы, дае і навучанне ў профільных класах, выпускнікі якіх пры выкананні пэўных умоў — адзнацы па профільным прадмеце не ніжэй за 8 і агульны бал атэстата не ніжэй за 7 — могуць паступіць у профільныя ВНУ на адпаведныя спецыяльнасці на льготных умовах.

Яшчэ адзін важны аргумент: неабходна пераламаць тую тэндэнцыю, калі мы рыхтуем спецыялістаў па прынцыпе «абы рыхтаваць». Яны павінны быць запатрабаваны. А самы яркі паказчык запатрабаванасці — мэтавая падрыхтоўка. Што датычыцца выкарыстання такой магчымасці, каб гарантавана паступіць ва ўніверсітэт, — перш чым падумаць пра такое, малады чалавек павінен уважліва пазнаёміцца з умовамі дагавора, дзе ўсё агаворана, у тым ліку і сітуацыя яго невыканання суіскальнікам. Наступствы сур'ёзныя. Акрамя таго, на гэтым этапе праходзіць сумоўе, па выніках якога заказчык і прымае адпаведнае рашэнне. А на этапе паступлення ў ВНУ для гэтай катэгорыі абітурыентаў уведзена абмежаванне, у выніку якога 20 працэнтаў бюджэтных месцаў (10 працэнтаў у медыцынскіх ВНУ) прызначаны толькі для паступаючых на агульных падставах, і гэтыя месцы мэтавікі не змогуць заняць.

Адной з галоўных пераваг мэтавага навучання таксама з'яўляецца гарантаванае месца працы і індывідуалізацыя працэсу навучання. Гэта значыць, сваю будучую спецыяльнасць студэнт можа вывучаць не толькі ў працэсе тэарэтычных спазнанняў — з пачатку навучання ён уключаецца ў працоўны працэс, праходзіць у арганізацыі практыку і абараняе дыплом па тэме, якая цікавая гэтай арганізацыі. У выніку туды прыходзіць не проста выпускнік ВНУ, а спецыяліст, якога ўжо не трэба вучыць вытворчым асновам.

***— Адной з прывабных для абітурыентаў і актуальнай для эканомікі краіны траекторый з'яўляецца паступленне на найбольш запатрабаваныя сёння спецыяльнасці...***

— Як вядома, сёлета на тры тысячы павялічана колькасць набору на бюджэтныя месцы, дарэчы, на платнае навучанне — наадварот, скарацілася. Дадатковы набор на гэтыя месцы ажыццяўляўся менавіта па запатрабаваных спецыяльнасцях. Гэта, як я ўжо казаў вышэй, інжынеры, медыкі, педагогі. Гэта аграрыі, работнікі сацыяльнай сферы і іншыя. У бягучым годзе пералік такіх спецыяльнасцяў павялічыўся на 16 і складае 69 пазіцый.

***— 2024 год адкрыў новыя магчымасці і для паступаючых у рэгіянальныя ВНУ. Якія яны?***

— «Зялёнае святло» атрымалі медалісты, пераможцы алімпіяд рэгіянальных універсітэтаў, выпускнікі профільных класаў. Што гэта дасць у далейшым? Рацыянальна прадуманае размеркаванне кадраў. Мы адыдзем ад сітуацыі, калі кваліфікаваныя спецыялісты канцэнтруюцца ў сталіцы. Рэгіёны ў іх таксама маюць вострую патрэбу. І яны таксама спецыялістаў з часам атрымаюць.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# НОВЫ БУДЫНАК СЕЛЬСАВЕТА І ДОМ ЗА АДНУ БАЗАВУЮ

**На будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры ў Мінскай вобласці выдаткуюць больш як 220 мільёнаў рублёў. За першае паўгоддзе асвоена больш за палову. Але пытанняў яшчэ шмат. Іх і абмеркавалі на пасяджэнні Мінскага аблвыканкама. Карэспандэнт «Звязды» высветліў, як ідуць справы з выкананнем інвестыцыйнай праграмы Міншчыны на 2024 год, а таксама з рэалізацыяй Указа Прэзідэнта «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустуючымі дамамі».**



Фота тэлеграм-канала «Мінская вобласць/пра галоўнае».

## Сады, паліклінікі і школы

«Будаўнічая галіна даволі праблемная. Нават пры наяўнасці фінансавання ў нас бываюць праблемы з уводам аб'ектаў у эксплуатацыю, — адзначыў **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН.** — Інвестыцыйная праграма вырашае шэраг важных пытанняў. Гэта і будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, якіх чакаюць людзі, і загрузка будаўнічай галіны. Прывяду адзін праблемны прыклад. У Івянцы закрылі мост на рамонт. Зараз аб'ект трэба аб'язджаць, што стварае пэўныя нязручнасці. За тыдзень я там праехаў два разы і не ўбачыў ніводнага работніка. Калі мы закрываем аб'ект, то трэба работы выконваць у сціснутыя тэрміны. Ёсць пытанні і па аб'ектах вытворчага будаўніцтва, і па жыллі».

Сёння ідзе будаўніцтва дзіцячага садка-ясляў на 200 месцаў у мікрараёне «Паўднёвы Захад» у Лагойску, прыбудовы будынка басейна з галерэяй у Мядзелі, дзіцячага садка ў Смілавічах. Таксама запланавана будаўніцтва хірургічнага корпуса № 2 абласной клінічнай бальніцы ў Лясным. Паліклініка ў Смалявічах, школа ў Фаніпалі, дзіцячы сад — пачатковая школа ў Слуцку, дзіцячы сад у Смілавічах — усе гэтыя аб'екты таксама хутка з'явяцца ў рэгіёнах.

Але важная яшчэ і інфраструктура. Сёння ў цэнтральным рэгіёне рэканструююць сістэмы каналізацыі Заслаўя, сістэмы водазабеспячэння ў Чэрвені. Таксама тут будуюць водазабор і станцыю абезжалезвання. У Смілавічах паляпшаюць сістэму цеплазабеспячэння і будуюць новую цеплакрыніцу на базе кацельні «Каледж». «Усе абяцанні павінны быць выкананы ў тэрмін», — падкрэсліў губернатар.

Сёлета пачалі будаваць будынак Астрашыцка-Гарадоцкага сельскага выканаўчага камітэта, фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Лескаўцы, сеткі штучнага асвятлення і дарогу ў Ждановічах.

«Вялізны паток людзей ідзе па гэтых месцах у Ждановічах. Трэба завяршыць асфальтаванне дарогі ад кальцавой да дамбы і зрабіць так, каб гэта было камфортна для жыхароў», — даручыў кіраўнік рэгіёна. Таксама працягваецца ўзвядзенне інжынернай інфраструктуры. Апераджальнымі тэмпамі асваенне сродкаў ажыццяўляецца ў Чэрвеньскім, Крупскім, Салігорскім, Мінскім раёнах.

У Жодзіне ўзвядуць будынак аўтастанцыі, а ў Стоўбцах у наступным годзе — тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. «Калі не пачнецца будаўніцтва, будуць прыняты кадравыя рашэнні», — папярэдзіў Аляксандр Турчын.

Нядаўна свае дзверы расчыніў фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Дзяржынску. Аб'ект адкрываў Прэзідэнт. ФАК стаў доўгачаканым і для жыхароў горада. Ачышчальныя збудаванні ў Фаніпалі пачалі рэканструяваць яшчэ год таму. Шмат часу заняла работа з дакументамі. Да канца 2024 года абяцаюць увесці ў строй.

Аляксандр Турчын падкрэсліў, што больш грунтоўнай павінна быць роля ўпраўлення капітальнага будаўніцтва, якое выступае заказчыкам па многіх праектах. Таксама важныя пастаянны тэхнічны нагляд за якасцю работ, праектаванне з рацыянальным выкарыстаннем усіх рэсурсаў.

Не менш важная тэма і будаўніцтва жылля. У эксплуатацыю ў рэгіёне ўвядуць амаль адзін мільён квадратных метраў жылля. Ужо цяпер для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, увялі ў эксплуатацыю 134 тысячы квадратных метраў. 418 жылых памяшканняў атрымалі шматдзетныя сем'і.

«Я хацеў бы, каб вынікам нашага пасяджэння стала ўнясенне ў праграму на 2025 год персанальнай адказнасці за ўвод аб'ектаў», — падсумаваў Аляксандр Турчын.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны практычна ўсе аб'екты, якія цяпер знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва і праектавання. «На тых, якія павінны быць завершаны ў гэтым годзе, спыняліся больш падрабязна, — адзначыў **намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Віктар РАГУСКІ.** — Час яшчэ ёсць прыкласці намаганні, каб увесці іх ва ўстаноўленыя тэрміны. Праграма вялікая, цалкам забяспечана фінансаваннем. Паказчыкі І паўгоддзя кажуць пра тое, што задача будзе выканана».

Уладкаваны пляж у Мядзелі. «Скончыцца купальны сезон на адкрытых вадаёмах — падорым жыхарам да 700-годдзя горада басейн. Тут будуць створаны ўсе ўмовы для плавання і ў добрае надвор'е, і ў несезон», — дадаў Віктар Рагускі.

У ліку аб'ектаў, якія рыхтуюць да ўводу ў эксплуатацыю, — новы будынак Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна ў Бараўлянах. «Вельмі важны і найбуйнейшы ў вобласці, а можа, нават у краіне сацыяльны цэнтр, які будзе ўведзены ў эксплуатацыю восенню. Ён будзе ўключаць у сябе комплекс і рэабілітацыйны, і аблічговы, і для пражывання, і для аднаўлення. Шэраг дашкольных устаноў таксама адкрыецца ў рэгіёнах вобласці», — сказаў намеснік старшыні Мінаблвыканкама.

## Пустуючыя дамы — у гаспадарчы абарот

Работа па рэалізацыі Указа № 116 праводзіцца на планавай аснове і дае пэўныя вынікі. За першае паўгоддзе ў гаспадарчы абарот у вобласці ўцягнута амаль 600 пустуючых дамоў і 153,4 гектара зямлі. У Адзіны рэестр пустуючых дамоў унесена за першае паўгоддзе 835 жылых дамоў (агульная лічба па Мінскай вобласці — 2809). Найбольшую цікавасць для куплі ў насельніцтва выклікалі дамы ў Салігорскім, Лагойскім і Валожынскім раёнах.

У Адзіным рэестры пустуючых дамоў можна не толькі паглядзець характарыстыкі таго ці іншага аб'екта, але і ў рэжыме анлайн убачыць яго месцазнаходжанне, фота, даведацца ўзрост і стан дома. Доступ да рэестра адкрыты і бясплатны. Акрамя таго, на публічнай кадастравай карце на падставе звестак рэестра размешчаны пласт з інфармацыяй пра месцазнаходжанне пустуючых жылых дамоў, прызначаных для продажу.

«Адзначаем некаторую нераўнамернасць па рэгіёнах. Бачым пытанні, якія трэба ўрэгуляваць. Указ № 116 дае магчымасць аператыўна, без затрымак далучаць у абарот участкі, прыватныя будынкі. Галоўная мэта — навядзенне парадку на зямлі», — адзначыў Віктар Рагускі.

Паводле яго слоў, важная сумесная работа выканкамаў, сельскіх Саветаў, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

### Спадабаўся «нічыйны» дом? Звяртайцеся ў сельсавет

Для набыцця пустуючага жылога дома ў вёсцы неабходна звярнуцца ў мясцовы выканаўчы камітэт. Продаж магчымы на аўкцыёне, без яго правядзення, а таксама ў фармаце электронных таргоў. Калі аўкцыён не адбыўся, праходзяць паўторныя таргі з паступовым зніжэннем кошту: спачатку на 50 працэнтаў, затым кошт памяншаецца на 80 працэнтаў і гэтак далей — аж да адной базавай велічыні.

Акрамя таго, абласныя выканкамы маюць права вызначаць населеныя пункты, на тэрыторыі якіх з улікам інтарэсаў дзяржавы і мясцовай спецыфікі эканомікі рэгіёна пустуючыя жылыя дамы можна прадаваць без аўкцыёнаў за адну базавую велічыню альбо ў фармаце таргоў з пачатковым коштам у адну базавую велічыню.

Пры продажы пустуючага жылога дома пакупніку можа давацца растэрміноўка аплаты на тэрмін да трох гадоў роўнымі долямі без індэксацыі плацяжоў. Пакупнік мае права выканаць абавязацельства па аплаце набытага пустуючага жылога дома датэрмінова.

Да таго ж у рамках Указа № 116 мясцовыя органы могуць даць грамадзяніну зямельны ўчастак з размешчаным на ім пустуючым жылым домам, які падлягае зносу. Пры гэтым новаму ўладальніку прыйдзецца альбо самастойна прыбіраць дом, альбо фінансаваць знос састарэлага жылля, альбо займацца яго рэканструкцыяй і капітальным рамонтам.

Прывесці жыллё ў парадак трэба на працягу года з моманту яго набыцця. Калі чалавек не ўкладваецца ў тэрмін, то пры наяўнасці ўважлівых прычын і пацвярджальных дакументаў яго могуць падоўжыць. У адваротным выпадку работы па зносе правядуць за кошт бюджэту, а новага землекарыстальніка абавяжуць пакрыць выдаткі аж да вырашэння пытання ў судовым парадку.

Купіць пустуючы жылы дом могуць не толькі беларусы, але і замежныя грамадзяне, а таксама асобы без грамадзянства. Не абмежаваныя ў гэтым і індывідуальныя прадпрымальнікі, юрыдычныя асобы.

Варта дадаць, што пасля куплі пустуючага дома новаму ўласніку трэба будзе атрымаць правапацвярджальныя дакументы, ажыццявіўшы дзяржаўную рэгістрацыю нерухомай маёмасці і правоў на яе. З моманту такой рэгістрацыі дзяржава гарантуе і можа забяспечыць абарону правоў на нерухомую маёмасць.

Акрамя таго, такі дакумент неабходны пры правядзенні любой аперацыі з аб'ектам. Напрыклад, калі трэба вылучыць долі ў кватэры ці доме, прадаць, купіць, здаць у арэнду жыллё. Таксама правапацвярджальныя дакументы спатрэбяцца пры любых судовых разглядах, звязаных з аб'ектам нерухомасці.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Поля Кагаме перавыбралі прэзідэнтам Руанды



Дзейны прэзідэнт Руанды Поль Кагаме, кандыдат ад кіруючай партыі «Руандыйскі патрыятычны фронт» (RPF), атрымаў перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у краіне з 99,18 працэнта галасоў. Гэта вынікае з канчатковых рэзультатаў, апублікаваных цэнтральнай выбарчай камісіяй Руанды, перадае PIA «Навіны». Выбары прэзідэнта Руанды прайшлі 15 ліпеня. На парламенцкіх выбарах, якія праходзілі адначасова, таксама перамагла кіруючая партыя Кагаме. Кааліцыя з удзелам «Руандыйскага патрыятычнага фронту» (RPF) атрымала парламенцкую большасць з 68,83 працэнта галасоў. Згодна з заканадаўствам, прэзідэнт Руанды выбіраецца тэрмінам на пяць гадоў не больш за два разы запар. З красавіка 2000-га краіну ўзначальвае Поль Кагаме. У 2015-м на рэферэндуме былі абнулены прэзідэнцкія тэрміны, і 66-гадовы Кагаме заняў пасаду ў трэці раз, захаваўшы права быць перавыбраным яшчэ двойчы.

### Міністр абароны Вялікабрытаніі заявіў аб сур'ёзных праблемах у войску

Джон Хілі заявіў, што стан брытанскіх Узброеных сіл «значна горшы, чым мы думалі». Аб гэтым паведаміў тэлеканал Sky News. «Мы ведаем, што ўсе тры службы (Каралеўскае войска, Каралеўскі флот і Каралеўскія ваенна-паветраныя сілы. — **Рэд.**) сутыкаюцца з вельмі сур'ёзнымі праблемамі: марнатраўствам пры закупках, нізкім баявым духам, недахопам кадраў, а таксама ветэраны не атрымліваюць доступу да паслуг, якіх яны вартыя», — заявіў Хілі на канферэнцыі Каралеўскага аб'яднанага інстытута абаронных даследаванняў (RUSI). Міністр дадаў, што пасля двух тыдняў знаходжання новага ўрада ва ўладзе стала прыкметна, што гэтыя праблемы значна больш сур'ёзныя, чым здавалася раней. У лютым гэтага года быў апублікаваны даклад камітэта па абароне пры ўрадзе Злучанага Каралеўства, у якім гаварылася, што колькасць Узброеных сіл Вялікабрытаніі скарачаецца хутчэй, чым адбываецца новы набор. У камітэце заклікалі ўрад паскорыць рэформы па мадэрнізацыі ваеннай прамысловасці і паляпшэнні ўмоў працы абслуговага персаналу.

### Колькасць ахвяр апоўзняў у Эфіопіі перавысіла 150 чалавек



З-за сходу двух апоўзняў на поўдні Эфіопіі загінулі па меншай меры 157 чалавек, перадае Reuters са спасылкай на прадстаўніка ўрада. «Пошукі ўсё яшчэ працягваюцца. Раён вельмі складаны», — адзначыў кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па рэагаванні на стыхійныя бедствы ў зоне Гофа Маркас Мелезе.

Паводле яго слоў, колькасць загінулых можа павялічыцца. Па словах мясцовых чыноўнікаў, першы апоўзень накрыў людзей у зоне Гофа ў рэгіянальным штаце Паўднёвая Эфіопія. Пасля чаго другі апоўзень абрынуўся на тых, хто сабраўся для аказання дапамогі. У ліпені ва ўсходнеафрыканскай краіне пачаўся разгар сезона дажджоў, які працягнецца да сярэдзіны верасня. Гэта становіцца прычынай апоўзняў у некаторых частках Эфіопіі.

# І Ў АГОНЬ, І Ў ВАДУ, І НА ЛЮБЫЯ ВЫШЫНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першае падобнае мерапрыемства было арганізавана Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях у мінулым годзе. Яно атрымала водгук у журналісцкім асяроддзі, таму працу ў гэтым кірунку было вырашана працягнуць, пашырыўшы склад удзельнікаў.

Мэта семінара — павышэнне ўзроўню кампетэнтнасці работнікаў друкаваных, радыё і тэлевізійных СМІ ў пытаннях, звязаных з дзейнасцю органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, а таксама знаёмства блогераў і журналістаў з прафесіяй «ратавальнік-пажарны».

У гэты раз усіх прысутных падзялілі на групы і правялі ўводны інструктаж па тэхніцы бяспекі. Пасля гэтага групы разышліся па інтэрактыўных пляцоўках. Усяго іх было восем. На кожнай можна было атрымаць тэарэтычныя веды па бяспецы і практычныя навыкі дзеянняў у розных надзвычайных сітуацыях.

## ЗБОР І ВЫЕЗД ПА ТРЫВОЗЕ

Першым выпрабаваннем нашай групы стала адпрацоўка збору і выезду пажарнага разліку па трывозе. Па нарматыве ратавальнікам даецца 40 секунд на тое, каб адправіцца на выезд. Пры гэтым 20 секунд адводзіцца на надзяванне спецыяльнага адзення — «баёўкі». Яна складаецца з камбінезона, спецыяльных ботаў, ахоўнай курткі, пояса, шлема і пальчатак. Па адчуванні — гэта, як апрануць зімовую вопратку летам. Варта адзначыць, што касцюм адзін — і на зіму, і на лета. І калі нам было невыносна горача ў звычайны летні дзень, то што ўжо казаць пра ратавальнікаў, якія пры такой тэмпературы змагаюцца з полымем, да прыкладу, у палаючым і задымленым памяшканні? Можна толькі захапіцца вытрымкай ратавальнікаў, якія ў такой вопратцы не проста пазіруюць для рэпартажу, а рэальна ратуюць людзей. Бо адно толькі нашэнне спецыяльнага касцюма — ужо велізарная праца.

## МЕДЫЦЫНСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА

На лакацыі аказання першай дапамогі навучылі правілам выканання штучнай вентыляцыі лёгкіх, непрамога масажу сэрца і прыёму Геймліха (пры ўдушшы або закаркаванні верхніх дыхальных шляхоў).

Манекен, на якім журналісты адпрацоўвалі непрамы масаж сэрца, быў абсталяваны адмысловымі датчыкамі, з дапамогай якіх на планшэце можна бачыць, ці правільна ратуюць умоўнага пацярпелага. Гэта дазваляла карэкціраваць сілу націску на грудную клетку і частату націскаў. Таксама на спецыяльным манекене ратавальнікі паказалі, як рэаніміраваць немаўлят.

Варта адзначыць, што такія навыкі карысныя не толькі для ратавальнікаў, але і для простых людзей, бо ніколі не ведаеш, што можа здарыцца з чалавекам у паўсядзённым жыцці.

## ДЫМАКАМЕРА

Цяжэй за ўсё было ў дымакамеры, дзе неабходна таксама надзець на сябе апарат на сціснутым паветры і кіслародную маску. Сам балон важыць больш за дзесяць кілаграмаў, пры гэтым, каб яго правільна замацаваць, трэба падскочыць і рэзка пацягнуць за шлейкі. Разам з экіпіроўкай вага такога боекамплекта дасягае 20 кілаграмаў, а ратавальнікі часцяком маюць пры сабе яшчэ лом, ліхтарык і вяроўку, бегаючы, прысядаючы і выносячы на сваіх плячах пацярпелых.

Гэтая пляцоўка паказала, як адчуваюць сябе супрацоўнікі МНС, калі заходзяць у задымленае памяшканне для выратавання людзей з агню. Каманда рухалася звяном у чатыры чалавекі. У поўнай цемры, хай і не адразу, журналістам удалося «выратаваць» манекен, які выяўляў «пацярпелага». Яго вынеслі з памяшкання і акуратна паклалі ў цянёк.

У суцэльнай цемры практычна нічога не было відаць. Цяжка ўявіць, што адчувае ратавальнік, які заходзіць у моцна задымленае памяшканне. Пры гэтым на яго яшчэ ўздзейнічае вялікая тэмпература. А для яго гэта фактычна руціна, звычайныя будні...

## ЛІКВІДАЦЫЯ ЎЗГАРАННЯЎ

Знаёмства з прафесіяй ратавальніка будзе няпоўным, калі не адчуць сябе ліквідатарам пажару, няхай і ўмоўнага. Таму лакацыя «Ліквідацыя ўзгаранняў» таксама



ўваходзіла ў праграму семінара. Дарэчы, выйсці сухім з вады не ўдалося, бо давялося пазнаёміцца з пажарным рукавом.

Тут важна моцна стаяць на нагах, таму што пры падачы вады праз рукаў адбіваецца аддача, якая можа паваліць чалавека на зямлю! Таксама трэба прыкладаць вялікія намаганні, каб разгортваць яго, рухаючыся наперад. Пазней, зноў апрануўшыся ў «баёўку», з дапамогай вогнетушыцеля мы ліквідавалі ўмоўнае ўзгаранне.

## ПРАМЫСЛОВЫ АЛЬПІНІЗМ

Мабыць, самая цікавая і экстрэмальная лакацыя. Тут нам распавялі і паказалі, як працаваць з альпінісцкім абсталяваннем, якое выкарыстоўваецца пры выратаванні людзей на вышыні. Усе жадаючыя змаглі спусціцца ўніз пры дапамозе тросаў з вышыні каля 20 метраў, а таксама ўзлезці па 10-метровым скаладроме.

На журналістаў начапілі спецыяльныя рамяні і тросы. Не забыліся і пра страхоўку, паказалі прынцып працы ўсёй канструкцыі. Паспрабаваўшы павісनуць на вяроўках на невялікай вышыні ад зямлі і зразумеўшы, як усё ўладкавана, каманда перайшла да асноўнага спуску. Дарэчы, карэспандэнт «Звязды» настолькі гэтым захапіўся, што напрасіўся спусціцца такім чынам аж некалькі разоў! Галоўнае — не глядзець уніз...



## ПАЖАРНА-РАТАВАЛЬНЫ СПОРТ

Далей журналісты паспрабавалі свае сілы ў адной з дысцыплін пажарна-ратавальнага спорту — пад'ёме па штурмавой лесвіцы на трэці паверх вучэбнай вежы. І зноў вышыня. Толькі ў гэты раз трэба не спускацца ўніз, а лезці ўверх. І зноў для журналістаў арганізатарамі былі падрыхтаваныя страховачныя тросы.

На другі паверх па прыстаўленай лесвіцы залезці было не цяжка. Цяжка было падымацца далей. Таму што перад гэтым давялося самастойна перакінуць лесвіцу на паверх вышэй, седзячы на падаконніку. Але і гэтым разам прадстаўнікі СМІ справіліся з выпрабаваннем. А вось ад прапановы падняцца яшчэ вышэй далікатна адмовіліся.

## ДЭБЛАКАВАННЕ ПАЦЯРПЕЛАГА ПРЫ ДТЗ

Не абышлося без дэманстравання асаблівасцяў працы пры дэблакаванні пацярпелых у дарожна-транспартных здарэннях і работы з гідраўлічным інструментам — галоўным прыладай у гэтай нялёгкай справе. Журналісты не толькі ўбачылі, як адбываецца працэс «разразання» элементаў аўто, але і самастойна зрабілі гэта, узяўшы ў рукі абсталяванне ратавальнікаў. Дарэчы, вага гідраўлічнага інструмента немаленькая. І з такім грузам трэба яшчэ здолець працаваць дакладна і акуратна, каб не нашкодзіць пацярпеламу. Пасля журналістаў навучылі карыстацца вогнетушыцелем. І ў нас атрымалася патушыць узгаранне!

## ВЫСТАВА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ТЭХНІКІ

На гэтай інтэрактыўнай лакацыі размясціліся найноўшыя ўзоры тэхнікі і сродкаў індывідуальнай абароны ратавальнікаў, а таксама элементы спецыяльнай ахоўнай экіпіроўкі пажарных. Там жа свае навыкі прадэманстравалі чатырохногія памочнікі — лабрадоры рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» Дарк і Гром.

Асаблівае ўражанне на гэтай лакацыі на журналістаў зрабілі ўздым на пад'ёмніку і аўталесвіцы на вышыню да 55 метраў, што адпавядае прыкладна 18 паверхам звычайнага жылога дома. Пасля спуску на вяроўцы стаяць нагамі на больш-менш цвёрдай паверхні, хай і на вышыні, было не страшна. Напружваў толькі вецер, які трохі разгойдваў пад'ёмнік на вышыні.

## ПАЖАРНАЙ СЛУЖБЕ БЕЛАРУСІ — 171 ГОД

Пасля паспяховага праходжання ўсіх інтэрактыўных зон праца журналістаў не скончылася. **Міністр па надзвычайных сітуацыях, генерал-маёр унутранай службы Вадзім СІНЯЎСКІ** пасля рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць адразу прыехаў ва Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, каб пагутарыць з прадстаўнікамі СМІ, адказаць на пытанні. Атрымалася шчырая, сяброўская размова.

«Сёлета 25 ліпеня пажарнай службе Беларусі спаўняецца 171 год. Гэта быў доўгі шлях ад першай пажарнай каманды ў Мінску да сучаснага Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Калі распаўся СССР, мы былі вымушаныя ісці ўласным шляхам спроб і памылак. Па-сапраўднаму ведамства пачало развівацца пасля таго, калі мы выбралі Прэзідэнта, калі ён пачаў звяртаць увагу на пытанні надзвычайных сітуацый і, у першую чаргу, пытанні ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Менавіта тады, у 1994 годзе, было створана Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», — сказаў Вадзім Сіняўскі.

19 студзеня 1999 года была створана сістэма органаў і падраздзяленняў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Вось з гэтага дня фактычна можна казаць аб сучасным МНС. Кіраўнік ратавальнага ведамства адзначыў шэраг дасягненняў міністэрства за мінулыя гады. «За трыццацігадовы перыяд у краіне выратаваны дзясяткі тысяч чалавечых жыццяў. Калі 20 гадоў таму на пажарах штогод гінула больш за 1000 чалавек, то сёння нам удалося знізіць гэтую лічбу больш чым у два разы. А гібель дзяцей зніжана больш чым у шэсць разоў. Штодзень на лінію 101 і 112 нашага Міністэрства паступае каля 800 паведамленняў, з якіх палова — гэта баявыя выезды», — адзначыў Вадзім Сіняўскі.

## ПРА НС — АПЕРАТЫЎНА

Ён дадаў, што ратавальнаму ведамству вельмі важна працаваць з прадстаўнікамі СМІ, таму што калі сістэма аператыўнага давядзення інфармацыі аб надзвычайнай сітуацыі і спрацавала, то гэта засталося па-за ўвагай насельніцтва. «Таму мы будзем рабіць высновы і ўдасканальваць гэтую працу. Але як захапіць розумы людзей, трэба, магчыма, павучыцца ў вас (журналістаў)», — прызнаўся Вадзім Сіняўскі.

Гаворачы аб дзяржаўнай сістэме папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, міністр адзначыў, што яна патрабуе ўдасканалення. «Кіраўнік дзяржавы раскрытыкаваў міністэрства як каардынатара работы дадзенай сістэмы, і гэта падстава для пераацэнкі і пастаноўкі дадатковых для сябе задач па яе ўдасканаленні», — адзначыў Вадзім Сіняўскі.

Сярод высноў з сітуацыі, акрамя ўвагі да ўспрымання інфармацыі насельніцтвам, стаіць пытанне ўдасканалення арганізацыі прыёму, аналізу, абагульнення і давядзення да ўсіх зацікаўленых аператыўнай інфармацыі аб рэальных наступствах стыхійнага бедства, развіцця ўстойлівай энергетычнай інфраструктуры, а таксама захавання нарматыўных патрабаванняў па аднаўленні сувязі для абанентаў у выпадку надзвычайнай сітуацыі аператарамі сотавай сувязі.

Семінар атрымаўся насычаным, яркім і багатым на эмоцыі. Задумка арганізатараў — даць магчымасць удзельнікам пражыць адзін дзень у рытме людзей, якія штодня ратуюць чалавечыя жыцці, удалася. І журналісты, і блогеры ў поўнай меры адчулі на сабе не толькі вагу ратавальнага абмундзіравання, але і груз адказнасці за забеспячэнне бяспекі, папоўнілі багаж карысных ведаў і атрымалі мноства ўражанняў.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**



# Першае месца

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Якраз цяпер учарашнія студэнты, якія толькі што атрымалі прафесійную адукацыю, робяць свае першыя крокі ў выбранай прафесіі. Псіхолагі падлічылі: кабпрызвычаіцца да першага працоўнага месяца пры так званай першаснай адаптацыі (калі гаворка ідзе пра дасведчанага спецыяліста, гэта завецца «другасная адаптацыя», і яна, зразумела, праходзіць лягчэй і хутчэй), патрабуецца да чатырох месяцаў. І яшчэ адна цікавая лічба: большасць людзей, якія звольніліся з таго ці іншага прадпрыемства ці арганізацыі ў першыя два гады з пачатку работы, прымалі гэтае рашэнне ў першыя два тыдні на працоўным месцы. Калі адаптацыя праходзіць паспяхова і маладому супрацоўніку ўдаецца лёгка ўліцца ў калектыў, шанц, што ён затрымаецца ў кампаніі больш чым на два гады, узрастае прыкладна на 70 %, сцвярджаюць псіхолагі.

## З пункту гледжання работніка

— Адаптацыя на першым рабочым месцы мае на ўвазе наступныя віды — сацыяльную, вытворчую (прафесійную), псіхалагічную, арганізацыйную, эканамічную і нават фізіялагічную, — кажа **практыкуючы псіхолаг, гештальт-тэрапеўт Кацярына АЛЁХІНА.**

Сацыяльная адаптацыя — гэта паспяховае ўключэнне ў сацыяльнае асяроддзе таго працоўнага калектыву, дзе вам прыйдзецца працаваць (вывучэнне норм і правіл паводзін, прынятых у калектыве, знаёмства з калегамі, даданне ў чат вашага аддзела або кампаніі, калі такі ёсць). Псіхалагічная адаптацыя блізкая да сацыяльнай: вы становіцеся «сваім», вас прымаюць калегі.

— Заўважу, што на рабоце мы праводзім без перабольшання палову, а часам і большую частку жыцця, а значыць адносіны ў працоўным калектыве не менш важныя, чым у сям'і, — адзначае суразмоўніца.

Вы вызначаеце сваё месца ў камандзе; разумееце, да каго ў калектыве па якім пытанні можна прыйсці, хто можа дапамагчы і падказаць, калі нешта незразумела.

Вытворчая (а таксама прафесійная) адаптацыя — гэта пра «крылатую фразу» вопытных работнікаў: «Забудзьцеся пра ўсё, чаму вас вучылі, і пачынайце вучыцца нанова». Фраза, вядома, катэгарычная, але ўсё ж шмат у чым яна дакладная. Таму на многіх складаных вытворчасцях распаўсюджаны інстытут настаўніцтва, калі маладога спецыяліста на практыцы знаёмяць з абсталяваннем і праграмным забеспячэннем, з якімі яму трэба будзе мець справу. Сюды ж адносіцца ацэнка маладым спецыялістам асабістых перспектыў прафесійнага і кар'ернага росту.





Эканамічная адаптацыя — гэта прывыканне да ўзроўню зарплаты, на які вы можаце разлічваць. Калі вы былі класічным студэнтам, жылі на стыпендыю ў інтэрнаце, гэты аспект можа парадаваць. Можа і засмуціць, калі вы разлічвалі на большае. У любым выпадку, атрымаўшы першы заробак, важна навучыцца суразмерваць свае патрэбы з магчымасцямі, як гэта робяць дарослыя людзі (бо вы больш не навучэнец, а спецыяліст, які ўжо амаль што атрымаўся).

Ну а арганізацыйная адаптацыя — гэта прыстасаванне да графіка работы, разлік часу, каб прыходзіць на яе без спазненняў; высвятленне, дзе сталовая і як прайсці ў пакой адпачынку; ці прынята ў гэтай кампаніі затрымлівацца на працоўным месцы пасля заканчэння рабочага дня або прапускаць абедзенны перапынак, калі «спраў безліч». І нарэшце, адаптацыя фізіялагічная мае на ўвазе прыстасаванне да распарадку дня, які дыктуе ваша першая работа (асабліва калі, напрыклад, яна прадугледжвае начныя змены). Калі вам заўтра ўставаць у шэсць гадзін раніцы, мабыць, не варта заседжвацца з сябрамі ці за камп'ютарам да глыбокай ночы, як гэта можа дазволіць сабе студэнт...

## З пункту гледжання работадаўца

— Але, акрамя ўласных намаганняў, малады спецыяліст сутыкаецца, скажам так, са «стылем адаптацыі новых супрацоўнікаў», які прыняты ў той арганізацыі, куды ён прыйшоў працаваць, — распавядае псіхолаг.

Асноўных падыходаў кіраўніцтва да гэтага пытання псіхолагі налічваюць тры. І два з іх — няпростыя для пачаткоўца. Першы можна назваць «Назіральным», тут дэвіз кіраўніцтва — «Пакажы, на што здольны, а мы цэбе ацэнім». Ён можа быць характэрны для буйных кампаній, дзе працаваць прэстыжна і кадравых праблем няма. Часам у такіх арганізацыях перакананыя, што малады супрацоўнік павінен адразу ўсвядоміць, як яму пашанцавала, і старацца з усіх сіл. У гэтым выпадку ні настаўніцтва, ні дадатковага навучання не мяркуецца. І гэта, мабыць, самы няўдалы падыход, кажа псіхолаг: ён правакуе стрэсы, пачуццё сваёй нікчэмнасці і некампетэнтнасці, а значыць, хуткае выгаранне.

Другі падыход — «шокавы»: «Каб навучыць плаваць, кідай у ваду». Першыя месяцы становяцца для пачаткоўца экстрэмальнымі: яму даюць няпростыя заданні, ставяць нязручны графік, на які не згаджаюцца вопытныя і каштоўныя кадры, «затыкаюць ім усе дзіркі». Калі чалавек валодае мэтанакіраванасцю і матывацыяй, ён праявіць сябе і заслужыць павагу ў калектыве. Але людзі з іншым псіхалагічным складам могуць проста «зламацца», перастаць верыць у сябе. Калі ў сацсетках пішуць: «Не магу больш адпрацоўваць па размеркаванні!», цалкам магчыма, што ў арганізацыі, куды трапіў учарашні студэнт, прыняты такі стыль адаптацыі.

І нарэшце, падыход «сяброўскі» — самы паспяховы і для пачаткоўца, і для прадпрыемства, ён



паказвае на эфектыўную і сучасную кадравую палітыку. Малады спецыяліст максімальна лёгка і без стрэсу ўваходзіць у свае прафесійныя абавязкі, часта да яго прымацоўваюць настаўніка, работнікі са стажам падказваюць і падтрымліваюць. Гэты варыянт — добрая заяўка на тое, што малады спецыяліст на доўгія гады застанецца працаваць тут пасля завяршэння адпрацоўкі па размеркаванні (хоць, вядома, на такое рашэнне ўплывае мноства фактараў).

## Зрабі сам

Што можна параіць маладому спецыялісту?

— Памятаць, што як мінімум 60 % поспеху ў «першаснай адаптацыі» ўсё ж вынік вашых намаганняў, — падкрэслівае суразмоўніца.

► Перш за ўсё, азнаёмцеся са службовымі інструкцыямі, іншымі дакументамі, якія вызначаюць кола вашых прафесійных абавязкаў і ўнутраны распарадак арганізацыі. Падыдзіце да гэтага аспекту сур'ёзна, бо такім чынам вы знойдзеце для сябе адказы на мноства пытанняў.

► Звярніце ўвагу на «першае ўражанне». Калі ў кампаніі прыняты дрэс-код, прытрымлівайцеся яго. Калі не — імкніцеся выглядаць сціпла і ахайна, бо «сустракаюць па адзенні». І ні ў якім выпадку не спазняйцеся — так вы прадэманструеце, што работа для вас важная. Лепш у першыя дні прыйсці крыху загадзя і патраціць час на азнаямленне з вытворчымі задачамі — гэта будзе «плюс», які паставяць вам і начальства, і калектыў.

► Праявіце цікавасць да калег: важна ўключыцца ў працоўны калектыў. Можна нават купіць торцік, якім пачаставаць калег у абедзенны перапынак. Або спячы пірог.

► Не бойцеся пытацца, і галоўнае — не трэба баяцца магчымасці памыліцца. Памыляюцца ўсе, а вы толькі пачынаеце свой прафесійны шлях. Таму, калі няўпэўнены, звярніцеся да дасведчанага калегі за парадай, а калі ўсё ж памыліліся — прызнайце сваю памылку і больш яе не паўтарайце.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Асабісты вопыт

**Алена КЛІШЭВІЧ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Я была абсалютна гатовая да работы, калі прыйшла на сваё першае працоўнае месца, у сярэднюю школу № 1 майго роднага Нясвіжа. Валодала і дастатковымі ведамі, і добрай матывацыяй, і ўпэўненасцю ў правільнасці выбару прафесіі. Што адчувала? Мабыць, была шчаслівая, бо мяне ўзялі ў школу, якую я скончыла з медалём, дзе я абагаўляла сваіх настаўнікаў — педагагічны калектыў, які яшчэ нядаўна вучыў мяне і ў які я павінна была ўліцца. Мусіць, мне было прасцей, чым іншым маладым спецыялістам: я, па сутнасці, пасля вучобы ў БДУ ў Мінску проста вярнулася дадому, у сваю родную школу. Яна заўсёды была і застаецца сёння адной з наймацнейшых адукацыйных устаноў нашай краіны і па ўзроўні ведаў, якія даюцца вучням, і па педагагічным складзе. Ці хвалявалася я тады? Вядома. Ці баялася ў нечым памыліцца, неяк выпадкова падвесці сваіх настаўнікаў, калектыў? Так, хвалявалася, і так, баялася. Але я дакладна ведала, чаго хачу — выкладаць сваю любімую беларускую мову і літаратуру, рускую мову і літаратуру, прафесійна расці. Зразумела, прыйшлося сутыкнуцца і са складанасцямі. На маім першым уроку прысутнічала завуч, яна зрабіла мне некалькі заўваг. І я са сваім «сіндромам выдатніцы» ўспрыняла сітуацыю балюча, вельмі перажывала. Але разуменне прыходзіць з вопытам: цяпер я вельмі ўдзячная і завучу, і дасведчаным калегам — я ўлічыла ўсе недахопы, на якія яны ўказалі, і гэта дапамагло зрабіць мае ўрокі лепш, а навучальны працэс — больш эфектыўным. Вельмі дапамагла мне і мая мама, яна была загадчыцай дзіцячага садка. Яе парада была такой: «Ніколі не павышай голас на дзяцей, не смей абражаць іх. Кожнае дзіця ўжо з трох гадоў — асоба. Знаходзь іншыя рычагі ўздзеяння: праз любоў, павагу, дысцыпліну. І, галоўнае, не забывайся: кожнае дзіця ў тваім класе — тваё ўласнае».

Памятаю, мне ў першы ж год далі класнае кіраўніцтва. І згуртаваць усіх нас — і дзяцей, і іх бацькоў — мне ўдалося, калі мы афармлялі наш клас. Мы ўпрыгожылі яго стэндамі пра класнае жыццё, пра беларускіх пісьменнікаў, пра родны Нясвіж. Ідэя выклікала энтузіязм у вучняў, ім дапамагалі мамы і таты, атрымалася вельмі прыгожа. Што б я параіла маладым спецыялістам для паспяховай адаптацыі на першым працоўным месцы — дык гэта паважаць свае прафесійныя абавязкі і задачы як справу свайго жыцця. І ставіцца да людзей, з якімі вы працуеце — калег і кіраўніцтва, — з павагай і ўвагай. Калі вы не паважаеце калег, наўрад ці вы «прыжывяцеся» ў калектыве. А калі без павагі ставіцеся да сваёй работы, вам няма чаго рабіць у прафесіі. Памятайце: гэта ваш выбар, вы яго свядома зрабілі, уклалі ў навучанне прафесіі асабістыя намаганні і свой час, дык станьце прафесіяналам выбранай справы. Гэта закладзе аснову вашага жыццёвага поспеху.

Дзейныя асобы

# У ДЫЯЛОГУ З ЖЫЦЦЁМ ВАЖНА НЕ ПЫТАННЕ, А НАШ АДКАЗ

**Культурная, навуковая і тэатральная грамадскасць Беларусі адзначае 80-годдзе доктара філалагічных навук, прафесара, член-карэспандэнта НАН Беларусі Сцяпана Сцяпанавіча Лаўшука, аднаго з самых таленавітых даследчыкаў айчыннай гуманітарыстыкі, якому ўдалося... Каб пералічыць усё, не хопіць ніякіх газетных старонак, а таму вельмі коратка.**



Творчасць народных майстроў заўжды цікавіць даследчыка Сцяпана ЛАЎШУКА.

Нарадзіўся Сцяпан Сцяпанавіч у маляўнічым усходнепалескім гарадку Васілевічы ў сям'і чыгуначнага майстра, што важна — у дзень і год поўнага вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта, хай падсвядома, магло паўплываць на выбар імя, якое далі немаўляці: Сцяпан у перакладзе з грэчаскай мовы азначае «вянец», «вянчаны», сімвалізуе перамогу, трыумф.

Пад такім вось знакам у вялікай сям'і (разам з бацькамі 11 чалавек) і праходзіла станаўленне творчай асобы будучага прафесара. З адзнакай скончыўшы сярэднюю школу, юнак паступіў на філалагічны факультэт БДУ, падчас вучобы ўдзельнічаў у рабоце навуковых гурткоў і асваенні цалінных земляў, займаўся спортам. Потым, атрымаўшы дыплом, настаўнічаў на Лунінеччыне, працаваў у райкаме камсамола. Аднак імкненне да творчай самарэалізацыі брала і ўрэшце... узяло такі верх: Сцяпан Сцяпанавіч паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, прысвечаныя беларускай драматургіі.

...Амаль кожную творчую асобу ў любой галіне вызначае дамінуючая «одна, но пламенная страсть». Напэўна, не памылюся, калі зазначу, што для С. С. Лаўшука такім вось пачуццём-захапленнем стала любоў да тэатра, якая пачалася з маленства, з праслухоўвання казак, перадач па радыё.

Нам, філолагам, добра вядома, што праца па даследаванню драматургічных жанраў толькі на першы погляд здаецца простай, аднак у сапраўднасці авалодаць ёю знаскоку амаль немагчыма: сур'ёзных спецыялістаў-даследчыкаў у гэтай галіне вобмаль, можна сказаць... І найпершы сярод іх — менавіта Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук. (Паказальна, што прафесар арганічна-артыстычны і ў штодзённым побыце: ён да сёння ў нашу досыць руцінную навуковую працу прыўносіць пэўныя элементы нестандартнасці ці нават святочнасці.)

...Па сваіх чалавечых якасцях Сцяпан Сцяпанавіч прыроджаны лідар. Менавіта яны, вось такія, вучаць нас шукаць і знаходзіць сваю місію, ставіць перад сабой высокія жыццёвыя мэты і настойліва іх дабівацца. «У дыялогу з жыццём важна не наша пытанне, а наш адказ», — слушна заўважыла руская паэтка Марына Цвятаева. Прафесар Лаўшук, сканцэнтраваўшыся на даследаванні праблемных пытанняў развіцця драматургічных жанраў, змог увесці ў кола свайго дыскурсу амаль увесь «залаты» фонд нашай нацыянальнай драматургіі. Ён, таленавіты даследчык і грунтоўны аналітык, зрабіў вялікі ўнёсак у станаўленне і развіццё айчынных літаратуразнаўчай, тэксталагічнай навук.

Сцяпанам Сцяпанавічам асабіста падрыхтаваны да выдання зборы твораў Уладзіслава Галубка, Кандрата Крапівы, Андрэя Макаёнка; Сцяпан Сцяпанавіч кіраваў навуковым калектывам па падрыхтоўцы збору твораў — у 10-ці тамах — свайго калегі і земляка, народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі.

Прафесар Лаўшук з'яўляецца сябрам Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў, старшынёй беларускага аддзялення Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры. Дваццаць гадоў таму абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі, Сцяпан Сцяпанавіч па сённяшні дзень займае пасаду галоўнага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры і паранейшаму трымаецца прынцыпу: ні дня без радка. У выніку ён аўтар каля трохсот навуковых артыкулаў, добрага дзясятка манаграфічных прац, сярод якіх больш чым важкі ўклад у напісанне чатырохтомнай «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя». (Тут не лішнім будзе заўважыць, што даследчыкі іншых краін былога СССР не змаглі пакуль напісаць такога фундаментальнага літаратуразнаўчага выдання).

Вялікая праца зроблена прафесарам Лаўшуком і па ўвекавечанні памяці слаўных людзей беларускай навукі і культуры. Пад кіраўніцтвам Сцяпана Сцяпанавіча выдадзены зборнікі ўспамінаў пра акадэмікаў І. Навуменку, В. Івашына, прафесараў Ю. Пшыркоў, П. Лысенку. З самага заснавання нашага нацыянальнага свята Дня беларускага пісьменства, у рамках якога пачала працаваць Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», С. С. Лаўшук з'яўляецца яе нязменным навуковым кіраўніком.

...Цікаўны, дасведчаны і прынцыповы даследчык клапоціцца аб працягу сваёй навуковай справы, вялікую ўвагу ўдзяляе падрыхтоўцы маладых кадраў, многіх, што называецца, ставіць на крыло для творчага палёту.

За шматгадовую навуковую і грамадскую дзейнасць Сцяпан Сцяпанавіч узнагароджаны ордэнам Францішка Скарыны, знакам «Выдатнік друку Беларусі», з'яўляецца лаўрэатам Рэспубліканскай прэміі прафсаюзаў за найлепшы твор у галіне культуры і літаратуры, адзначаны многімі памятнымі медалямі.

...Свой 80-ы дзень нараджэння юбіляр сустракае ў звычайных навуковых і жыццёвых клопатах. Мы, сябры і калегі, вучні і аднадумцы шчыра зычым яму моцнага здароўя і аптымізму — дасягнення новых вяршынь!

**Ігар Шаладонаў,**
*г. Мінск.*

*Рэдакцыя газеты «Звязда», падпісчыкам якой ці не ўсё жыццё з'яўляецца шаноўны Сцяпан Сцяпанавіч, далучаецца да гэтых віншаванняў і пажаданняў, а наш калега Яўген Пясецкі — спадарожнік прафесара на «дарогах да святыняў» — дадае здымак.*

Была вайна

# БРАТ ЗА БРАТА,
## АЛЬБО ХАДЗІЛІ ХЛОПЧЫКІ Ў РАЗВЕДКУ

**...Калі ў інтэрнэце запытаць інфармацыю пра самага юнага партызана Вялікай Айчыннай вайны, то можна даведацца, што гэта — Паўлік Канапацкі, адзін з 15 тысяч народных мсціўцаў.**

Паўлік нарадзіўся ў 1932 годзе ў мястэчку Лахва Лунінецкага раёна, трохі пазней яго сям'я перасялілася на Любанскія хутары. Там яе і заспела вайна.

У лясах непадалёку дыслацыраваліся атрады партызан. Сярод іх быў досыць блізкі сваяк, праз якога Канапацкія перадавалі мсціўцам прадукты харчавання, звесткі пра ворагаў.

Аб тым, як і варта было чакаць, даведаліся паліцаі, і сям'я мусіла падацца ў лес. У партызанскім атрадзе імя Сталіна старэйшы сын Іван у свае 17 былі залічаны ў баявы састаў. Вясной 43-га ён атрымаў заданне прабрацца ў вёску Сінкевічы, знайсці сувязных, каб з іх дапамогай раздабыць харчаванне для партызан, але нарваўся на засаду, быў паранены і памёр ад страты крыві.

Яго малодшы брат Паўлік пакляўся адпомсціць за старэйшага і сястру, якая памерла ад тыфу, і сам папрасіўся ў разведчыкі. Яму было ўсяго 12. Невысочанькі, хударлявы, ён, апрануўшыся пастушком, хадзіў да чыгункі, сачыў за рухам цягнікоў, за тым, дзе месцяцца немцы і паліцаі. Ніхто з іх і падумаць не мог, што гэта разведчык...

У яго між тым былі і досыць рызыкоўныя вылазкі. Напрыклад, у вёсцы ў адзін з халодных вечароў Паўлік убачыў крытую машыну са скрынямі — падумаў, што там можа быць зброя. Каб праверыць, стаў сачыць за вартавым, які то падыходзіў да машыны, то ішоў у глыб двара пад застрэшак (дзьмуў пранізлівы вецер, імжэў дождж).

Паўлік вычакаў зручны момант, сігануў у кузаў. Там у скрынях і сапраўды былі патроны і гранаты. Штo-нішто «пастушок», ледзь не трапіўшы на вочы вартавому, прыхапіў з сабой...

У атрадзе вельмі любілі гэтага смелага хлопчыка, давяралі яму, яго, як разведчыка, асабіста хваліў Герой Савецкага Саюза Васіль Захаравіч Корж. А калі ў атрад прылятаў з Масквы ваенны карэспандэнт Уладзімір Лупейка, то не абышоў увагай і юнага Паўліка. Фатаграфія хлопчыка ў партызанскай форме з карабінам ёсць ва ўсіх значных музеях краіны.

...У дарослым жыцці лёс кідаў Паўла Іванавіча Канапацкага і ў паўночны Мурманск, і на казахстанскую цаліну. Аднак найболей ён жыў у роднай Лахве, на беразе любімай ракі Смердзь. Цяпер яго дом пустуе, дзеці разляцеліся па свеце, але ж памяць — жыве.

**Сцяпан Нефідовіч,**
*аг. Любань, Лунінецкі раён.*

Чалавек — чалавеку

# Трэба нечым захапляцца...

**...У юнацтве я любіў пасвіць коней, хадзіць у грыбы, працаваць на зямлі, захапляўся паштовымі маркамі, збіраў значкі. Але ж галоўным захапленнем і былі, і засталіся ў мае 90 — кнігі, у тым ліку з аўтографамі аўтараў: Аляксея Пысіна, Янкі Брыля, Івана Шамякіна, Ніла Гілевіча, Віктара Карамазава, Рымы Казаковай...**

Да глыбіні душы люблю родную мову і сваю зямлю. А таму дзе аб'ехаў, дзе пехам абышоў усю Магілёўшчыну, пабываў у Ленінградзе, Маскве, на экскурсіях і ў санаторыях Прыбалтыкі, Грузіі, Азербайджана...

Не раз наведваў Эрмітаж і Траццякоўскую галерэю, тэатры Масквы і Мінска. У Адэсе слухаў песні Уцёсава, у Магілёве — Кабзона, Сенчынай, П'ехі, Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча...

Быў на радзіме Льва Талстова ў Яснай Паляне, пакланіўся праху Тургенева, Цютчава, Пушкіна, Ясеніна, Элізы Ажэшкі і Якуба Коласа. Магілу паэта Аляксея Пысіна бачу з балкона сваёй кватэры.

Люблю даглядаць кветкі. Яны ў мяне ў кухні, у пакоі, а летам — яшчэ і на балконе... Гадоў колькі таму «ўзяў шэфства» над падаконнікам у пад'ездзе. Штогод збіраю лекавыя травы, раблю настойкі і адвары амаранту шыпшыны, меліса, мяты...

Пералічыў, вядома ж, хіба дзясятую частку. І ўсё для таго, каб сказаць: калі нечым захапляешся і займаешся, жыццё становіцца больш цікавым і змястоўным, а значыць, лепшым і даўжэйшым. Яно, здаецца, таго варта.

**Віктар Арцем'еў,**
*г. Магілёў.*

Усмешачку

# СКУПАЯ «ВАРАЖБІТКА»...

**Кажуць, адзін мужчына зразумець не мог, куды яго жонка грошы дзявае. Абураўся, скандаліў, аж да таго, што сышоў з дому — стаў гаспадарыць сам. А ўжо як...**

**Грошы, што адклаў на першы месяц, скончыліся праз тыдзень, што адклаў на другі (ён ужо эканоміў!) — праз два, цягам трэцяга — чалавек проста зразумець не мог, адкуль яны браліся ў жонкі.**

Мы з мужам за грошы, дзякуй богу, ніколі не сварыліся, нават тады, калі іх не хапала. «Гэта з-за таго, што зязюлю не так сустрэлі», — пажартаваў неяк муж і налета ў чаканні птушкі ўжо загадзя збіраў дробныя манеты, раскладваў іх па ўсіх магчымых кішэнях...

Думаеце, хоць раз абхітрыў? Не!

Сёлета раніцай на лецішчы ўстаў, у трусах рушыў з хаты (я следам — раптам не здаровіцца?)... І зязюля тут як тут — са сваім «ку-ку». «Ну вось, — пакрыўдзіўся муж, — а мы зноў без грошай»...

Я, здаецца, яго «суцешыла»: «Зязюлька-зязюлька, колькі нам жыць?» — спытала ў птушкі. «Ку...» — праспявала «варажбітка» і... сціхла.

Трэба разумець, паўгода неяк працягнем?

**А. Смагіна,**
*г. Мінск.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 ліпеня 2024 г. № 27 (760)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ПОВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

# «МАЛАДЫЯ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ, ВАЛОДАЮЦЬ ЛІДАРСКІМІ ЯКАСЦЯМІ»

## У Мінскай вобласці выбралі новы склад Маладзёжнага парламента і падвялі вынікі работы папярэдняга



Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

**НА VI сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў выбралі новы склад Маладзёжнага парламента, у які ўвайшлі 46 чалавек. Гэта прадстаўнікі ўсіх раёнаў цэнтральнага рэгіёна. Захавана і пераемнасць — 30 працэнтаў кандыдатаў працавалі ў папярэднім скліканні. Таксама 23 чалавекі дэлегаваны ў Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся пра парадак дня сесіі, пазнаёміўся з маладымі дэпутатамі.**

### Прыклад для моладзі

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ** падзякавала хлопцам і дзяўчатам, якія працавалі ў першым складзе Маладзёжнага парламента. «Вопыт работы, вопыт стварэння Маладзёжнага парламента сапраўды каштоўны не толькі для Мінскай вобласці, але і для ўсёй краіны. Я бачыла, як вы пачыналі камунікаваць паміж сабой, як пакрысе далучаецеся да ўдзелу ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці Мінскай вобласці. Некаторыя з вас уваходзілі ў склад Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе. І вопыт, які вы атрымалі, працуючы разам з парламентарыямі, дэпутатамі розных узроўняў, стаў для вас неацэнным. Мы запрашалі вас на сесіі, вы ўдзельнічалі ў асабістых прыёмах, вас ні ў чым не абмяжоўвалі. Тым самым мы паказвалі, што вашы рашэнні і меркаванні — вельмі важныя для нас. І ні разу я не ўсумнілася ў вас», — адзначыла яна.

«Сёння тут знаходзяцца тыя, хто займае актыўную жыццёвую пазіцыю. Ініцыятыўныя, з лідарскімі якасцямі. І я ўпэўнена, што вы зможаце вакол сябе аб'яднаць аднадумцаў. У гэтым годзе адбыліся найважнейшыя палітычныя падзеі, і вы заўсёды былі побач, заўсёды былі прыкладам для моладзі. Колькі было арганізавана з вашым удзелам і пад вашай эгідай дыялогавых пляцовак, круглых сталоў? Колькі мы з вамі абмяркоўвалі заканадаўчых ініцыятыў, законапраектаў? Вы ж ва ўсім гэтым бралі ўдзел», — сказала Наталля Якубіцкая. Звяртаючыся да новага складу Маладзёжнага парламента, яна нагадала, што наперадзе важная палітычная падзея — прэзідэнцкія выбары. «Вы ж бачыце, у які складаны час мы жывём, але ён выбраў вас, і я на вас ускладаю самыя сур'ёзныя надзеі», — заключыла Наталля Якубіцкая.

Як заўважыла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, у Маладзёжны парламент прыходзяць людзі з розных прафесій. Але большую частку па-ранейшаму складаюць настаўнікі і медыкі.

«Вы сапраўды заявілі пра сябе ярка, крэатыўна і таленавіта. Па-іншаму гэта назваць нельга, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Вольга ТОПДЭМІР.** — Нягледзячы на тое, што ў нас цяпер сур'ёзны працоўны сход, ён у той жа час і ўрачысты, бо там, дзе моладзь, дзе працуюць такія прыгожыя і мэтанакіраваныя людзі, па-іншаму і быць не можа. Я жадаю, каб запал, усе пачынанні, якія ў вас ёсць і якімі вы дзяліліся ўвесь гэты час з нашымі рэгіёнамі, не знікалі. Заставайцеся такімі ж пазітыўнымі, працягвайце дзяліцца сваім вопытам з іншымі. Мы заўсёды бачым і цэнім вас, хочам, каб вы заўсёды былі побач».

### Ад рэферэндуму да Усебеларускага народнага сходу

Падрабязна аб выніках працы распавёў **старшыня Маладзёжнага парламента пры Мінскім абласным Савеце дэпутатаў 3-га склікання Аляксей ТАЎСТЫКА:**

«Пачатак нашага склікання прыходзіў на рэспубліканскі канстытуцыйны рэферэндум, а гэта — самая сапраўдная палітычная рэформа, якая ўплывае на наш лад. У нас не было часу на разварушванне, бо важныя палітычныя падзеі пайшлі адна за адной: рэферэндум, X Форум рэгіёнаў, Адзіны дзень галасавання...»

**_(Заканчэнне на 8-й стар.)_**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Лета — не час адпачываць

## Сенатары працуюць у рэгіёнах

• Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей Хаменка ў рамках работы рэспубліканскіх інфармацыйна-прапагандысцкіх груп правёў адзіны дзень інфармавання для работнікаў Дзяржынскага філіяла



Мінскага абласнога спажывецкага таварыства. Тэма размовы — «Моцны лідар — гарант стабільнасці і бяспекі дзяржавы: да 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва ў Рэспубліцы Беларусь». Галоўным дасягненнем палітыкі дзейнага Прэзідэнта Сяргей Хаменка назваў забеспячэнне і падтрыманне міру на беларускай зямлі. Увага ўдзельнікаў сустрэчы таксама была звернута на важную гістарычную дату — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і звязаныя з ёй урачыстыя і памятныя мерапрыемствы, якія праходзяць па ўсёй краіне. «Наша дзяржава імкнецца рабіць усё дзеля людзей і для людзей. А ад вас, звычайных грамадзян, залежыць толькі выбар правільнага шляху, якога мы будзем прытрымлівацца, каб супрацьстаяць знешнім пагрозам і захаваць стабільнае плаўнае развіццё», — адзначыў сенатар. На заканчэнне сустрэчы Сяргей Хаменка адказаў на пытанні, што паступілі ад работнікаў прадпрыемства.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Мазырскім раённым выканаўчым камітэце. Да парламентарыя звярнуліся па пытаннях, якія датычацца ўстанаўлення граніц зямельных участкаў, вырашэння зямельнай спрэчкі, нязгоды з рашэннем суда, работы ўстаноў аховы здароўя і інш.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей Сівец у рамках адзінага дня інфармавання правёў сустрэчу з працоўным калектывам ААТ «Планар». Сенатар расказаў пра гісторыю станаўлення інстытута прэзідэнцтва, галоўныя дасягненні маладой прэзідэнцкай рэспублікі і асабісты ўклад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ў пабудову суверэннай і незалежнай дзяржавы.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід Заяц наведаў Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці. Парламентарый правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Воранаўскім райвыканкаме. Таксама Леанід Заяц наведаў гаспадаркі Воранаўскага раёна, азнаёміўся з ходам уборкі ўраджаю збожжавых і фарміраваннем кармавой базы жывёлагадоўлі.

• Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Гарошкін прыняў удзел у пасяджэнні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя, якое прайшло ў Магілёве. Асноўная ўвага ўдзелена міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй, а таксама шэрагу ключавых культурных і сацыяльных ініцыятыў Саюзнай дзяржавы. Абмяркоўваліся перспектывы і дасягненні ў арганізацыі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва на прыкладзе Магілёўскай вобласці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «МАЛАДЫЯ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ, ВАЛОДАЮЦЬ ЛІДАРСКІМІ ЯКАСЦЯМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Паводле яго слоў, члены Маладзёжнага парламента актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні змяненняў у Канстытуцыю. «Мы таксама выбудоўвалі каналы камунікацыі не толькі паміж сабой, але і з працуючай і навучэнскай моладдзю, далі больш за 30 каментарыяў сродкам масавай інфармацыі, арганізавалі і ўдзельнічалі ў больш як 20 пляцоўках па абмеркаванні праекта змяненняў у Канстытуцыю. Акрамя таго, мы рэалізавалі праект «Зрабі свой выбар» для папулярызацыі рэферэндуму сярод моладзі», — дадаў Аляксей Таўстыка.

Перад адзіным днём галасавання дэпутаты Маладзёжнага парламента працавалі над павышэннем прававой культуры моладзі пры дапамозе праекта «Галасуем разам». «Мы абышлі кожную сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову, дзе правялі шэраг дыялогавых пляцовак, гаварылі пра важнасць выбараў для маладых людзей», — расказаў старшыня Маладзёжнага парламента.

«Мы арганізоўвалі круглыя сталы і дыскусійныя пляцоўкі. Гэта вельмі эфектыўная форма работы. Акрамя гэтага, мы дапамагалі ў рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў на мясцовым узроўні, займаліся арганізацыяй культурных, спартыўных і патрыятычных мерапрыемстваў», — падкрэсліў Аляксей Таўстыка.



Ён адзначыў, што за час работы дэпутаты Маладзёжнага парламента наведалі больш за 120 прыёмаў грамадзян, больш за 100 прамых тэлефонных ліній, больш за 80 пасяджэнняў раённых Саветаў дэпутатаў. Члены Маладзёжнага савета пастаянна прысутнічалі на пасяджэннях абласнога ўзроўню. Таксама імі было ініцыіравана і арганізавана больш за 340 мерапрыемстваў. Больш за 640 мерапрыемстваў яны наведалі па запрашэнні.

«Не было такога моманту ў працэсе нашай работы, каб члены Маладзёжнага савета мяне падвялі. Магчыма, у мяне не заўсёды атрымлівалася быць побач, але вы не ўяўляеце, як годна яны прадстаўлялі Маладзёжны парламент пры Мінскім абласным Савеце дэпутатаў на рэспубліканскім узроўні! Сапраўды выдатная работа! Мы заўсёды разам, а ўсе галіны ўлады — адзіныя. Толькі разам мы можам прыйсці да самага лепшага выніку», — адзначыла Наталля Якубіцкая.

## Маладзёжны парламенцкі рух — магчымасць заявіць пра сябе, праявіць грамадзянскую пазіцыю

«Праекты, якія былі рэалізаваны Маладзёжным парламентам пры Мінскім абласным Савеце дэпутатаў, адпавядалі патрэбам часу, — распавёў **старшыня камісіі па адукацыі і навуцы Маладзёжнага парламента пры Мінскім абласным Савеце дэпутатаў 3-га склікання Уладзіслаў ЖАЎНЯРОВІЧ.** — Калі мы ўключаліся ў парадак дня, звязаны з рэферэндумам па ўнясенні дапаўненняў і змяненняў у Канстытуцыю — і былі прыдуманы і рэалізаваны тэматычны праект «Галасуем разам». Вядома, мы не маглі прайсці міма найважнейшай гістарычнай падзеі ў нашай краіне — адзінага дня галасавання. Многія члены Маладзёжнага парламента працавалі ва ўчастковых, акруговых камісіях. Натуральна, мы ўключаліся ў парадак фарміравання палітычнай культуры і граматнасці моладзі, закранаілі розныя сферы жыццядзейнасці».

Ён звярнуў увагу, што маладзёжны парламенцкі рух — гэта ўнікальная магчымасць заявіць пра сябе, праявіць грамадзянскую пазіцыю, прыносіць карысць не словамі, а справай свайму рэгіёну, Беларусі. Паводле яго слоў, найважнейшы напрамак — гэта арганізацыя занятасці моладзі ў час па-за працай і вучобай. «Намі былі рэалізаваны розныя праекты ў спартыўнай і культурнай, адукацыйнай дзейнасці, у тым ліку трэнінгі, круглыя сталы, дыялогавыя пляцоўкі ў Мінскім раёне», — расказаў Уладзіслаў Жаўняровіч.

«За тры гады сістэма маладзёжнага парламентарызму станоўча зарэкамендавала сябе, даказала, што яна патрэбна. Спецыфіка ж работы Маладзёжнага савета ў тым, што на нашых пасяджэннях прысутнічаюць прадстаўнікі як заканадаўчай, так і выканаўчай улады. Гэта сведчыць пра давер да маладога пакалення», — сказаў Аляксей Таўстыка.

Ён расказаў, што ў Маладзёжны савет пры Нацыянальным сходзе вылучаецца адзін чалавек ад адной адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Калі разглядаць канкрэтна Мінскую вобласць, атрымаецца па адным чалавеку ад кожнага раёна і горада Жодзіна. Агульная колькасць — 23 чалавекі.

«Не заўсёды члены Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь уваходзяць у склад Маладзёжнага парламента пры Мінскім абласным Савеце дэпутатаў», — заўважыў Аляксей Таўстыка. І гэта, на яго думку, правільна. «Не варта абмяжоўвацца адным-двума чалавекамі і надзяляць іх рознымі паўнамоцтвамі. Варта грамотна размяркоўваць гэтыя паўнамоцтвы, каб было прадстаўніцтва як у раёне і вобласці, так і ў Нацыянальным сходзе. Другая прычына, чаму варта падзяляць — гэта велізарная праца. Яна цікавая і цяжкая, адымае даволі шмат часу. Таму сумяшчаць дзве, а то і тры грамадскія пасады, — вельмі цяжка і неэфектыўна. Маладое пакаленне, якое будзе прымаць рашэнне аб тым, куды дэлегавацца далей, павінна ўлічваць той факт: а ці змогуць яны пацягнуць тое, што ўзялі. На мой погляд, больш граматна праявіць сябе на вобласці, зрабіць нешта карыснае для жыхароў свайго раёна, а потым пераходзіць на рэспубліканскі ўзровень, чым ухапіць адразу ўсё і нічога не дасягнуць».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

# КАБ ПАМЯТАЛІ

**Жыхары вёскі Раманавічы Гомельскага раёна сваімі сіламі абнавілі памятны знак землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю знакавага месца памяці.**

Вяскоўцаў натхніў на гэту ініцыятыву прыклад жыхароў населеных пунктаў іх Улукаўскага сельсавета. Актывісты Улукая, Перамогі, Іпуці, Бярозак не так даўно правялі маштабную работу па адкрыцці ў аграгарадку Улукае памятнага знака землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ініцыятыўная група жыхароў сельсавета пры падтрымцы Улукаўскага сельвыканкама і аддзела культуры райвыканкама падрыхтавала праект грамадзянскіх ініцыятыў. Ён увайшоў у лік пераможцаў конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. З абласнога бюджэту на рэалізацыю ініцыятывы было выдзелена 10 тысяч рублёў. Дзесяць працэнтаў ад сумы, неабходнай на ўвасабленне ідэі ў жыццё, сабралі самі вяскоўцы.



Падключыліся да збору таксама прадпрыемствы, арганізацыі раёна, індывідуальныя прадпрымальнікі.

Ацаніўшы справу, за якую ўзяліся вяскоўцы Улукаўскага сельсавета, жыхары вёскі Раманавічы вырашылі добраўпарадкаваць існуючы ў іх населеным пункце памятны знак і прылеглую тэрыторыю сваімі сіламі. За справу ўзялася ініцыятыўная група вяскоўцаў: Таццяна Кавалёва, Ніна Помазава, Ала Саламыкіна, Святлана Сецкая і Святлана Бельская. Жанчыны займаліся арганізацыйнымі пытаннямі і аднаўленчымі работамі. Падтрымала вяскоўцаў у добрай справе і дэпутат Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, загадчык Раманавіцкага фельчарска-акушэрскага пункта Марыя Чуйкова.

Як распавяла дэпутат, жыхары Раманавічаў правялі суботнік, прыбралі хмызняковую расліннасць, якая закрывала пліты з імёнамі загінулых. Вяскоўцы добраўпарадкавалі клумбы, дзе высадзілі кусты руж. У аднаўленні меў патрэбу і сам памятны знак. Яго ўмацавалі цэментам і пафарбавалі. Аднавілі фарбамі і надпісы на мемарыяльных плітах. Гэтую частку работы ўзяла на сябе жыхарка Раманавічаў Яўгенія Туркова. Аднавілі вяскоўцы падчас добраўпарадкавання і памятную дошку ў гонар ураджэнца пасёлка Ільіч — Героя Савецкага Саюза Міхаіла Семянцова, які загінуў у 1945 годзе.

Дэпутат райсавета, загадчык Раманавіцкага фельчарска-акушэрскага пункта Марыя Чуйкова заўважыла, што жыхары Раманавічаў вельмі ўдзячныя за дапамогу ў ажыццяўленні патрыятычнай справы жыхарам мікрараёна «Раманавічы» Гомеля, а таксама прыхаджанам храма свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Раманавічах. Так, шмат неабыякавых людзей дапамагалі і фінансава, і фізічна ва ўвасабленні ў жыццё ініцыятывы: працавалі на суботніку, дапамагалі падчас аднаўленчых работ і добраўпарадкавання тэрыторыі вакол памятнага знака.

— Асаблівую падзяку выказваем савету ветэранаў Камуністычнай партыі Беларусі Чыгуначнага раёна Гомеля, а таксама асабіста нашаму земляку Віталю Мельнікаву, які ўваходзіць у склад гэтай арганізацыі. Яны закупілі новую плітку і выклалі пляцоўку і дарожку да помніка, замянілі старую агароджу на новую жалезабетонную. Так памятны знак і прылеглая тэрыторыя, сапраўды, значна змяніліся, — ад сябе асабіста і вяскоўцаў падзякавала за падтрымку дэпутат.

У Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля абноўленага помніка у Раманавічах прайшоў урачысты мітынг. Яго ўдзельнікі адзначалі, што значэнне ўвасобленай ў жыццё ініцыятывы вяскоўцаў цяжка пераацаніць. Пліты памятнага знака захоўваюць прозвішчы карэнных жыхароў Раманавічаў, герояў-франтавікоў, памяць пра іх вельмі важна захаваць будучым пакаленням.

— Работа па падтрымцы ў належным стане помнікаў і брацкіх пахаванняў на тэрыторыі сельсавета праводзіцца на сталай аснове. Праведзены капітальны рамонт брацкага пахавання ў аграгарадку Улукаўе, праведзены бягучыя рамонты ўсіх памятных знакаў і брацкіх пахаванняў у іншых населеных пунктах. Але вельмі прыемна, калі ініцыятыва добраўпарадкавання знакавага памятнага месца ідзе ад саміх жыхароў сельсавета. У Раманавічах людзі зрабілі добрую справу талакой, вынік вельмі радуе, — падкрэсліла старшыня Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна Жанна Бізня.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота Улукаўскага сельвыканкама Гомельскага раёна.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# ДЗЕНЬ ДЭПУТАТА Ў ХОДАСАХ

## Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як шараговая падзея стала яшчэ і святам

**СПРАВА ў тым, што Дзень дэпутата ў Ходасаўскім сельсавеце Мсціслаўскага раёна быў азнаменаваны яшчэ і адкрыццём Плошчы дзяржаўных сімвалаў у Ходасах. Свята прайшло з удзелам члена Савета Рэспублікі і старшыні Магілёўскага аблсавета Аляксандра Гарошкіна, а таксама кіраўнікоў Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрыя Пімашэнкі і райсавета Алены Клеянковай. На мерапрыемства сабралася шмат жыхароў, у тым ліку моладзі. «Кожны грамадзянін нашай краіны павінен ведаць дзяржаўныя сімвалы!»— гэты пасыл у Ходасах замацавалі рэальнай справай. Плошча з'явілася ў самым людным месцы аграгарадка, дзе ўсё побач — сельсавет, школа, прадуктовая крама, чыгуначная станцыя, прыпынак грамадскага транспарту.**



Старшыня Ходасаўскага сельсавета Анатоль Пруднікаў — дэпутат з агеньчыкам. Пад яго кіраўніцтвам рэалізуецца шмат ініцыятыў. Прычым нават не раённага маштабу. Дастаткова нагадаць пра тое, што Ходасы, напэўна, адзін з нямногіх невялікіх населеных пунктаў, дзе па ініцыятыве грамадзян каля воінскага мемарыяла зроблены вечны агонь. Зараз побач з ім з'явілася Плошча дзяржсімвалаў. Ініцыятыва, як і ў першым выпадку, грамадская.

Усё прайшло вельмі ўрачыста. Права ўнесці на плошчу сцяг было дадзена выхаванцам ваенна-патрыятычнага клуба «Юныя ратавальнікі», які існуе пры мясцовай школе. Хлопчыкі і дзяўчынкі ў прыгожай форме прайшлі, чаканячы крок, з зялёна-чырвоным палотнішчам у цэнтр плошчы. Сімвалічным момантам стала ўзняцце сцяга на флагшток — гэта зрабілі Аляксандр Гарошкін і ходасаўская школьніца Паліна Барысенка. За тым, як плаўна ўзносіцца ўверх



палотнішча, натхнёна назіралі і самыя маленькія ўдзельнікі мерапрыемства. Яны таксама зрабілі ўклад у свята свой унёсак — паказалі прыгожы канцэртны нумар.

Аляксандр Гарошкін павіншаваў жыхароў ад імя абласной выканаўчай і прадстаўнічай улад з 100-годдзем Мсціслаўскага раёна і адкрыццём у Ходасах такога знакавага аб'екта.

— Кіраўніцтва раёна і сельсавета зрабіла прыгожае мерапрыемства, якое наглядна дэманструе, як трэба ганарыцца нашай краінай і нашымі дасягненнямі, — адзначыў ён. — Сёння самая галоўная ўмова для захавання міру — гэта памяць аб вялікім ліхалецці, аб тых, хто 80 гадоў таму прынёс свабоду на нашу зямлю. І разуменне таго, за што нашы продкі аддалі свае жыцці. Калі пастаянна нагадваць пра гэта моладзі, яна ні за што не дапусціць, каб бяда зноў прыйшла на нашу зямлю.

Старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый Пімашэнка звярнуў увагу на ўрачыстасць моманту і яго важнасць.

— Маючы такое вялікае мінулае, мы не маем права дрэнна працаваць, — падкрэсліў ён. — Мы павінны выхоўваць у сваіх дзецях пачуццё патрыятызму, гонару за сваю краіну. Адкрыццё Плошчы дзяржсімвалаў — гімна, герба і сцяга — гэта вялікі гонар і не меншая адказнасць. Менавіта пад гэтымі сімваламі мы сёння будуем будучыню краіны пад кіраўніцтвам нашага лідара.

Штогод на тэрыторыі Ходасаўскага сельсавета рэалізуецца каля 15 ініцыятыў. І частка з іх датычыцца менавіта патрыятычнага выхавання моладзі. Яны звенні аднаго вялікага праекта пад назвай «Мы павінны ім Памяць». У рамках яго быў зроблены ў Ходасах парк Дружбы і адкрыты памятныя знакі ў гонар людзей, якія праславілі раён. Сёлета ў парку на алеі Герояў быў закладзены яшчэ адзін памятны знак — Герою Сацыялістычнай працы Уладзіміру Гарнастаеву.

У Ходасах стала традыцыяй выкарыстоўваць так званыя народныя грошы на новыя праекты. Апошнія тры гады сельсавет трапляе ў лік пераможцаў штогадовага спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання вобласці. Сёлета Ходасы па выніках работы за мінулы год атрымалі першую абласную прэмію. Па словах старшыні сельсавета Анатоля Пруднікава, яна пайшла на закупку дзіцячага гульнявога абсталявання для другой па ліку дзіцячай пляцоўкі ў аграгарадку.

— З бюджэту мы не бяром грошай, за выключэннем прэміі, якую зарабілі,— адзначыў суразмоўнік. — Гэта тыя сродкі, якія ўкладваюцца ва ўмацаванне нашай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Цяпер працуем над ініцыятывай па прывіцці моладзі любові да чытання. Устанавілі каля ходасаўскага Дома культуры бетонную фігуру чытаючай жанчыны і робім вільгацеўстойлівую шафу, пасля чаго запусцім праект. Кнігі для буккросінгу ўжо ёсць.

### Праблемы вырашаюцца разам

Дзень дэпутата прайшоў адначасова ў некалькіх населеных пунктах сельсавета. Прыёмы грамадзян вялі ў тым ліку мясцовыя дэпутаты. Да старшыні аблсавета Аляксандра Гарошкіна, які прымаў жыхароў у Ходасах, прыйшла староста аграгарадка Забалацце Наталля Кандраценка. Па яе ініцыятыве ў Забалацці нядаўна адкрылася дзіцячая пляцоўка. На гэты раз староста хадайнічала ад імя дарослага насельніцтва, якое пажадала мець трэнажорную залу. Яна расказала, што дзіцячая пляцоўка не прастойвае, на ёй заўсёды ёсць дзеці. «Мы самі зрабілі ім арэлі, з дапамогай калгаса рэканструявалі карусель, паставілі турнікі, лаўкі і ўсё гэта абнеслі агароджай, — расказала староста. — Цэнтр аграгарадка стаў больш





прыгожым, і дзеці занятыя. А вось дарослыя скардзяцца, што няма дзе спортам пазаймацца, ды і няма на чым. Мы ўжо і памяшканне адпаведнае знайшлі ў мясцовай бібліятэцы. Просім дапамагчы набыць некалькі трэнажораў».

Сенатар пагадзіўся, што ідэя слушная, вось толькі памяшканне трэба больш прыдатнае. Каб і плошчы хапала, і вентыляцыя была, і меры бяспекі не парушаліся. Жанчыне прапанавалі вулічны варыянт з трэнажорамі, але яна не пагадзілася. Маўляў, жыхары прасілі менавіта аб памяшканні. Летам у іх фітнес на агародах, а вось восенню-зімой яны будуць практыкавацца на трэнажорах.

Аляксандр Гарошкін паабяцаў, што пытанне будзе вывучана і рэалізавана. І падзякаваў за неабыякавасць да грамадскіх праблем.

— Улада будзе дапамагаць, але і насельніцтва не павінна быць убаку, — заўважыў ён. — Рукі жыхароў вельмі неабходныя для вырашэння іх жа праблем. Добра, калі людзі сігналізуюць, што ім трэба. Будзем дапамагаць.

Яшчэ адна заяўніца шукала садзейнічання ў рамонце дарогі па вуліцы Тэльмана. Сказала, што праблеме болей за 20 гадоў. Не дарога, а «вадкі асфальт», сказала жанчына, бруд, іншымі словамі. Дарогай займаліся, але там увесь час збіраецца вада, і тая становіцца непраходнай. Аляксандр Гарошкін паведаміў, што праблему на гэты раз будуць высвятляць больш грунтоўна з удзелам дарожных спецыялістаў.

Пасля прыёму грамадзян сенатар разам са старшынямі Мсціслаўскага райсавета Аленай Клеянковай і Ходасаўскага сельсавета — Анатолем Пруднікавым абмеркавалі найбольш праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць у раёне, і як яны вырашаюцца. Вельмі важнае месца ў вырашэнні надзённых пытанняў жыхароў займаюць актывісты. Накont старасты аграгарадка Забалацце, якая пабывала на прыёме, старшыня Ходасаўскага сельсавета Анатоль Пруднікаў заўважыў, што яна — чалавек на сваім месцы.

— Жанчына зрабіла неверагоднае, — паведаміў ён. — Раней людзей там нельга было расшавяліць. Але яна знайшла да іх падыход, і супрацоўніцтва пачалося. Знайшліся актывісты, якія ва ўсіх справах прымаюць непасрэдны ўдзел. Бабулі разам з унукамі шчыравалі на будаўніцтве дзіцячай пляцоўкі. Кожны вечар там прысутнічала да 20 чалавек. Дапамогу на набыццё піламатэрыялаў, каб паставіць агароджу вакол дзіцячай пляцоўкі, аказала грамадская арганізацыя «Белая Русь». Райвыканкам дапамог рабочай сілай і фарбай. Усё астатняе зроблена за грошы жыхароў і з іх непасрэдным удзелам. Адзначалася таксама, што трэба больш плённа супрацоўнічаць з землякамі, якія жывуць у іншых гарадах. Ёсць прыклады, калі яны прымаюць вельмі жывы ўдзел у жыцці раёна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Мсціслаўскі раён.*

### У тэму

Дэпутаты вобласці дзейнічаюць па ўсіх кірунках. На мінулым тыдні ў Магілёве працавала Камісія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя, якая разглядзела тэмы міжрэгіянальнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй на прыкладзе Магілёўскай вобласці. Як адзначыў Аляксандр Гарошкін, міжнародныя сувязі мацнеюць з кожным днём.

— Тон супрацоўніцтву з Расійскай Федэрацыяй задае наш Прэзідэнт. Мы бачым, колькі сустрэч ён праводзіць з кіраўнікамі рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, па такім жа плане працуюць і органы мясцовай улады. Для мяне як прадстаўніка заканадаўчай улады важна, што ідзе развіццё сацыяльных праектаў, так званай народнай дыпламатыі. І мы актыўна падключаем да гэтай дзейнасці моладзь. На Магілёўшчыне нарадзіўся праект «Дарогамі славы», які праводзіцца па ініцыятыве губернатара Магілёўскай вобласці і ўжо прыняў міжнародны характар, у ім удзельнічае не адзін рэгіён Расійскай Федэрацыі.

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ТАНЦАВАЛЬНАЙ ПЛЯЦОЎКІ

## Як грамадзянскія ініцыятывы спрыяюць здароваму ладу жыцця месцічаў

**СТАРЭЙШАЕ пакаленне жыхароў горада Масты добра памятае сваю летнюю танцпляцоўку ў цэнтральным парку. Але яна доўга не працавала. Літаральна два гады таму ўсё змянілася. Пляцоўку добраўпарадкавалі, загучала музыка, пачалі збірацца людзі. Дзякуючы праекту грамадзянскіх ініцыятыў тут плануецца зрабіць амфітэатр для правядзення летніх прадстаўленняў і мерапрыемстваў, вяровачны парк і іншыя цікавыя лакацыі.**



Новы праект пачаў рэалізацыю пад назвай «Масты-Арэна». Як паведаміла яго ініцыятар, загадчыца аддзялення Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мастоўскага раёна Кацярына Бурнос, штуршком стаў конкурс грамадзянскіх ініцыятыў, які летась быў арганізаваны Гродзенскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў пры падтрымцы Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. Ідэя нарадзілася літаральна адразу — стварыць у гарадскім парку зону адпачынку. Дарэчы, назву праекту «Масты-Арэна» прапанавала дырэктар Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Алена Мялешка. Увогуле такі кірунак, на думку сацыяльных работнікаў, павінен спрыяць актыўнасці людзей сталага ўзросту, іх пазітыўнаму настрою і ўмацаванню здароўя.

Па словах ініцыятара праекта Кацярыны Бурнос, асаблівых складанасцяў па фарміраванні праекта не было. Праўда, пэўныя перажыванні былі падчас правядзення вынікаў конкурсу. Бо на разгляд абласнога журы паступіла 30 праектаў. У выніку было выбрана шэсць ініцыятыў, сярод якіх аказаўся і мастоўскі праект. На яго рэалізацыю выдаткоўваецца 44 тысячы рублёў. Дзесяць працэнтаў з раённага бюджэту, астатнія — з абласнога і рэспубліканскага. Мяркуецца, што работы будуць завершаны да канца года. Цяпер вядзецца падрыхтоўка тэрыторыі, праведзена працэдура закупак.

Акрамя амфітэатра праект прадугледжвае стварэнне навеса з вяровачным гарадком і дзіцячыя арэлі. Лакацыя будзеastaноўлена ўздоўж набярэжнай ракі Нёман, якая цячэ ў самым цэнтры горада. Дарэчы, менавіта такая асаблівасць горада ў свой час стала повадам для будаўніцтва тут самага доўгага ў Беларусі пешага падвяснога моста. Зараз яго разабралі, каб аднавіць у новым стылі. Мост якраз і знаходзіцца побач з паркам. Сюды прыязджае шмат турыстаў, каб паглядзець на гэты незвычайны аб'ект.

— Стварэнне комплекснай пляцоўкі будзе садзейнічаць не толькі развіццю танцавальнай і музычнай культуры горада, але і развіццю турыстычнага кірунку, — упэўнена ініцыятар праекта. — Плануецца, што тут будуць праводзіцца паэтычныя вечарыны, адукацыйныя праграмы, майстар-класы, заняткі Школы актыўнага даўгалецця.





Культурная праграма горада багатая і разнастайная, кажа Кацярына. Тут «прапісаліся» такія мерапрыемствы, як фестываль сям'і, свята працаўнікоў сяла «Дажынкі», Дзень горада, свята ракі Нёман, фестываль патрыятычнай песні, Дзень абароны дзяцей «Фарбы дзяцінства», фестываль «Красуй, Мастоўшчына» і іншыя. Большасць іх можна будзе праводзіць на аднаўленай пляцоўцы гарадскога парка. Такім чынам, мерапрыемствы стануць больш масавымі і разнастайнымі, палепшацца ўмовы іх правядзення.

Старшыня Мастоўскага Савета дэпутатаў Валерый Табала паведаміў, што гэта ўжо трэці праект грамадзянскіх ініцыятыў раёна. Два папярэднія рэалізаваны падчас абласнога конкурсу, арганізаванага асацыяцыяй мясцовых Саветаў і Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў. Дзякуючы конкурсу, у аграгарадку Дубна з'явілася дзіцячая пляцоўка. Другі праект — патрыятычны. Вынікам яго рэалізацыі стала добраўпарадкаванне брацкай магілы ў вёсцы Княжаводцы. За кошт праекта праведзена рэканструкцыя абеліска і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Праектам прадугледжаны і турыстычны маршрут «Дарогай памяці»з правядзеннем экскурсій.

Працягам праектнай дзейнасці стане яшчэ адна ініцыятыва мастаўчан «Масты-Арэна-2», якая таксама заяўлена на конкурс. Яна павінна стаць завяршальным этапам стварэння паркавай зоны адпачынку. «Ініцыятыва грамадзян павінна быць пачута, бо людзям лепш бачна, на што варта звярнуць увагу, — лічыць старшыня Мастоўскага райсавета Валерый Табала. — У сваю чаргу улады заўсёды гатовы падтрымаць актыўных жыхароў».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота mosty-zara.by.**

### У тэму

Па выніках правядзення адкрытага конкурсу праектаў грамадзянскіх ініцыятыў 2024 года былі адзначаны шэсць найбольш значных праектаў у сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай сферах. На іх фінансаванне прадугледжаны сродкі абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў сумесна з удзелам ініцыятараў і іншых зацікаўленых суб'ектаў. Агульны аб'ём фінансавання на 2024 год складае 300 000 рублёў. У рамках конкурсных грантаў будуць рэалізаваны праекты па будаўніцтве дзіцячай і спартыўнай пляцоўкі, добраўпарадкаванні вёскі, сквера і іншыя.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12.119. Нумар падпісаны ў 19.30 23 ліпеня 2024 года.

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# КОБРЫН І ВАКОЛІЦЫ

